„Разьвіць узмоцненую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў" (ЦК УсеКП(б))

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 241 (4146)
СУБОТА 5 верасьня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

16 РАЁНАЎ УБРАЛІ ЛЁН

За зьдзельшчыну, за ўлік, за разьмеркаваньне працы!

Да асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі мы падышлі з новымі посьпехамі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

На 30 жніўня 46,6 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР калектывізавана. Мы маем паасобныя раёны, дзе ў асноўным **ужо завершана** суцэльная калектывізацыя. Да такіх раёнаў адносяцца: Койданаўскі—дзе калектывізавана 93 проц. гаспадарак, Лепельскі—82,7 проц., Клімавіцкі—80,3 проц. і інш.

Калектыўныя гаспадаркі паказалі новыя прыклады высокай прадукцыйнасьці працы і пераваг аграмаджанага земляробства.

Палова калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ёсьць перш за ўсё **буйная перамога генэральнай лініі партыі над правымі апартуністамі і «левымі» загібшчыкамі.**

Але бальшавікі прывыклі лічыць моцнымі і непарушнымі свае заваёвы толькі тады, калі яны і **арганізацыйна замацаваны.** Іменна так і ставіць пытаньне пастанова ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня г. г. аб тэмпах далейшай калектывізацыі і задачах узмацненьня калгасаў.

Гэтай пастановай ЦК выразна вызначыў, што барацьба за далейшы рост калектывізацыі толькі тады будзе грунтоўнай і пасьпяховай (а не раздутымі процантамі), калі яна базуецца і ідзе **НА АСНОВЕ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ.**

Даючы гэту дырэктыву ЦК паказаў і тое асноўнае зьвяно, ад якога залежыць посьпех работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Такім зьвяном партыя лічыць пераход калгасаў на **ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ І РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ДАХОДАЎ ПА ПРАЦАДНЁХ,** на падставе дакладнага **ЎЛІКУ КОЛЬКАСЬЦІ І ЯКАСЬЦІ ПРАЦЫ** кожнага калгасьніка. Зьдзельшчынай і ўлікам мы павінны начыста ліквідаваць кулацкую **ЎРАЎНІЛАЎКУ,** гаспадарча ўмацаваць калгасы і забясьпечыць далейшы іх рост.

Як на справе ажыцьцяўляецца гэта важнейшая дырэктыва партыі?

Сёньня мы зьмяшчаем зводку аб пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну (на 30 жніўня).

Як відаць з гэтай зводкі, **становішча з тэмпамі пераводу калгасаў на зьдзельшчыну, і асабліва па запісах у кніжках,—зусім нельга прызнаць здавальняючым.**

Адна пятая калгасаў яшчэ зусім не пераведзена на зьдзельшчыну; асабліва нездавальняючае становішча з арганізацыяй **запісаў у працоўных кніжках.** Так, у **Парыцкім** раёне з 103 калгасаў, атрымалі кніжкі 57, а запіс праводзіцца толькі ў 12 калгасах (21 проц.).

У **Чырвонапольскім раёне** з 112 калгасаў — адпаведна 49 і 12 (29 проц.). Такіх раёнаў ня мала. Зусім ясна, што пры такіх **тэмпах** пераводу на зьдзельшчыну, мы ня зможам забясьпечыць правільнае і своячасовае разьмеркаваньне калгасамі даходаў 1931 г.

Між тым, дырэктыва Калгаспэнтру патрабуе ад праўленьняў калгасаў: **да 1 лістапада прыкладна вызначыць і разьмеркаваць, згодна адпрацаваных дзён, дзьве трэці часткі даходаў кожнага калгасьніка, а да 15 студзеня 1931 г.—поўнасьцю разьлічыцца з кожным калгасьнікам.** Ні адзін калгас не павінен разьмяркоўваць ураджай па душах.

Гэтыя дырэктывы красамоўна гавораць, куды павінна быць накіравана цяпер галоўная ўвага праўленьняў калгасаў і партыйных арганізацый—па зьдзельшчыну, на падлік і запіс працы ў кніжкі.

Тут патрэбна ўдарная, сапраўды бальшавіцкая сумесная работа парт-арганізацый, праўленьняў калгасаў і рэвкамісіі. Трэба абвясьціць самую жорсткую барацьбу самацёку і спробам разьмеркаваць даходы па душах, выпадкам авансаваньня бяз уліку таго, ці выконваюцца калгасьнікам вытворчыя заданьні.

Трэба памятаць, што **правільнае разьмеркаваньне даходаў зьяўляецца вузлавым пытаньнем арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня КАЛГАСАЎ, важнейшай прадпасылкай для далейшага росту калгаснага руху.**

Вядучы бязьлітасную барацьбу з скажэньнямі лініі партыі ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва, узьнімем калгасную вытворчасьць на вышэйшую ступень, забясьпечым гэтым новыя перамогі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

За зьдзельшчыну, за ўлік, за разьмеркаваньне даходаў па працы!

Арганізацыяй ільнянога канвэеру, разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва змагацца за поўную перамогу на фронце ільнаўборкі

Апрацоўку ільну на поўны ход

Тэмпы ўборкі ільну за апошнюю пяцідзеньку ганебна зьнізіліся. З 25 да 30 жніўня выцераблена ільну толькі 10% агульнага пляну, у той час, як чацьвертая пяцідзеўка — з 15 да 20-га жніўня, дала прыросту 23,1 проц. Зьніжэньне тэмпаў намецілася ўжо ў пятай пяцідзеўцы, за якую было выцераблена 18,7 проц.

План церабленьня ільну на 30 жніўня выкананы на 79,2 проц.

Такім чынам у апошнюю пяцідзеўку павінна быць убрана 20,8 проц. ільну.

16 РАЁНАЎ — Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Жлобінскі, Ельскі, Лоеўскі, Лельчыцкі, Парыцкі, Рэчыцкі, Церахаўскі, Чачэрскі, Чырвонапольскі, Хойніцкі, Бярэзінскі, Клімавіцкі і Клічаўскі — ільнаўборку правялі сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі і на 1 верасьня скончылі церабленьне.

Адстаўшыя-ж раёны па ільнаўборцы, павінны мабілізаваць усе сілы, каб у бліжэйшыя дні поўнасьцю скончыць церабленьне ільну.

Спробы тлумачыць зьніжэньне тэмпаў уборкі ільну «аб'ектыўнымі» прычынамі, напрыклад, дажджом, недахопам машын і г. д., самым рашучым чынам асуджаны бліскучымі прыкладамі ўзмацненьня ўборкі ільну ў вышэйпаказаных раёнах.

Там, дзе на барацьбу за лён сапраўды былі мабілізаваны масы, дзе раённыя арганізацыі ўзначалілі энтузіязм калгасьнікаў і калгасьніц, уборку ільну арганізавалі на аснове сацыялістычных мэтадаў працы—спаборніцтва і ўдарніцтва, дзе ўсе работы былі пераведзены на зьдзельшчыну і правільна пастаўлен улік працы,—там лён убраны своячасова.

Жыткавіцкі, Слуцкі, Чырвона-Слабодзкі, Крупскі, Сенненскі, Сіроцінскі і Сураскі раёны за апошнюю пяцідзеўку, на гледзячы на часткова дажджлівае надвор'е выцерабілі ад 25 да 38 проц. агульнай плошчы ільну. За гэту-ж пяцідзеўку рэкордны процант уборкі ільну даў Барысаўскі раён—46,5 проц. У Барысаўшчыне на 25 жніўня было убрана толькі 35,2 проц., а на 30 жніўня—81,7 проц.

Разам з гэтым рад раёнаў, як Бабруйскі, Нараўлянскі, Рагачоўскі, Старобінскі і інш. выканаўшы план ільнацераблення на 80-90 проц., парашылі адпачыць і ў выніку апартуністычнай бязьдзейнасьці за гэту пяцідзеўку, церабленьне ільну ня зрушылася ўперад ні на адзін процант.

Адстаюць па-ранейшаму: Заслаўскі, Горацкі, Быхаўскі, Капыльскі, Касьцюковіцкі, Мсьціслаўскі, Менскі, Плешчаніцкі, Асьвейскі, Бешанковіцкі і Полацкі раёны.

Зусім дрэнна ідзе ачоска галован, замочка і расьсьціп ільнасаломы.

Паміж церабленьнем і апрацоўкай ільну ёсьць пагражаючы разрыў. Апошнія весткі гавораць, што для ліквідацыі гэтага разрыву, рад раёнаў ня прымае рашучых захадаў. Так, на 30 жніўня ачосана 32,3 проц., замочана і разаслана 25,6 проц. у адносінах да выцераблененага ільну. Рад раёнаў, скончыўшы ўборку, марудна пераключаецца на апрацоўку ільну. Заканчваючы церабленьне ва ўсю шырыню трэба разгарнуць апрацоўку ільну. Ні аднэй жмені ільну і насеньня ў гэтым годзе не павінна прапасьці.

Першапачатковая апрацоўка—вельмі адказная задача ў барацьбе за лён. Раённыя арганізацыі павінны дабіцца такой расстаноўкі сіл, каб усьпед за церабленьнем, праводзілася апрацоўка ільну. Апрацоўка ільну павінна прайсьці ў максымальна-кароткі тэрмін. Трэба сачыць, каб лён своячасова быў вынуты з мачыльных ям, расьцелен і своячасова ўбраны са сьцеліш.

Прыклад таго, як трэба змагацца за лён паказвае калгас «Чырвоны Кастрычнік» Вушацкага раёну, аб якім сёньня мы друкуем матар'ялы. Гэты калгас высунуў сустрэчны план уборкі і абавязаўся скончыць церабленьне, мочку і расьсьціп ільну да 1 верасьня. Аднак, дзякуючы правільнай арганізацыі працы, сустрэчны план быў выкананы на 5 дзён раней, г. зн. 26 жніўня.

У гэтым калгасе разам са зборкай ільну са сьцеліш пачалося мяцьцё. Ужо здана 3 цэнтн. ільну дзяржаве з урэджаю г. г.

Бальшавіцкую перамогу ў барацьбе за лён атрымаў Гарадоцкі раён, які на 3 верасьня ўбраў 13.000 гэкт. ільну, што складае 98 проц. плошчы, прычым за гэты час ачосана 50 проц., расьцелена і замочана 40 проц. выцераблененага ільну.

ІЛЬНЯНЫ КАНВЭЕР ПАВІНЕН СТАЦЬ АДНЫМ СА СРОДКАЎ БАРАЦЬБЫ ЗА СВАЯЧАСОВУЮ ЎБОРКУ І ЗДАЧУ ДЗЯРЖАВЕ ІЛЬНУ.

Адначасова з разгортваньнем ачосу, мочкі, расьсьціпу і падняцьця трасты, па вінна цалкам і поўнасьцю скончыцца падрыхтоўка сушылень, завоз ільнамялак, а таксама і ільнатрапалак. У гэтай галіне справа пастаўлена незадавальняюча. Рамонт старых 100 ільнаапрацоўчых пунктаў і 15 пунктаў па апрацоўцы канапель не пачаты. З намечаных для пабудовы 400 новых ільнаапрацоўчых пунктаў, пакуль што арганізаваны толькі 190. Арганізацыя астатніх пунктаў павінна неадкладна разгарнуцца ва ўсіх райнах.

У жорсткай барацьбе з кулацтвам, якое імкнецца сарваць бальшавіцкія пляны ўборкі ільну, даючы адпор правым і «левым» апартуністам, раённыя партарганізацыі павінны біцца за 100 проц. увядзеньне зьдзельшчыны і дакладны ўлік працы і скончыць у тэрмін уборку і апрацоўку ільну.

Трактар выходзіць на зяблёва.

Да 10 верасьня скончыць апрацоўку ільну

ГАРАДОК. (Па тэлеграфу). 3 верасьня па Гарадоцкім раёне церабленьне ільну ў асноўным скончана. Выцераблена 13.000 гэкт., што складае 98 проц. агульнай плошчы. Абмалочана і ачосана 50 проц., заслана і замочана 40 проц. Бярэм на сябе абавязак скончыць апрацоўку ільну да 10 верасьня.

Сакратар райкому АРАШЧУК
Старшыня РВК САПРЫЦКІ.

93,2 проц. пасеваў ільну выцераблена

Рэдакцыі газэты „Зьвязда"

ВУШАЧЫ. (Па тэлеграфу). На 1 верасьня па калгасах Вушацкага раёну выцераблена 1927 гэкт. ільну, або 93,2 проц. пляну, па аднаасобным сэктары — 1.855 гэкт., або 85,2 проц.

Разгортваем апрацоўку ільну.

Райза ДЗЯМЕНЬЦЕЎ.

10 калгасаў першымі ў раёне скончылі ўборку ільну

ДУБРОЎНА, 4. (БЕЛТА). На аснове зьдзельшчыны, сацспаборніцтва і ўдарніцтва 10 калгасаў Мардашэвіцкага сельсавету да 1 верасьня скончылі ўборку ільну і прыступілі да абмалоту, мочкі і сланьня. Калгасы імя Белдрэс і імя Молатава абмалацілі лён на 50 проц., калгас імя Будзённага — на 75.

ПАЛОМКА МАШЫН--ВЫНІК АБЯЗЬЛІЧКІ

ХОЙНІКІ. У саўгасе Руданова, Хойніцкага раёну, ня ўведзена зьдзельшчына і не ліквідавана абязьлічка. У выніку гэтага наглядаецца сыстэматычнае псаваньне машын. Апорная ячэйка сельпарткому, гэтымі пытаньнямі не займаецца.

Час узяцца за працу. Абязьлічка павінна быць ліквідавана, а ўсе работы пераведзены на зьдзельшчыну.

М. ОСІПАЎ.

НЕАДКЛАДНА АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ САНМІНІМУМ

Іастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што побач з дасягненьнямі, якія ёсьць у справе культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых, санітарнае становішча прадпрыемстваў, буйных новабудоўляў, торфараспрацовак і ўсіх іншых сэзонных работ і ўпарадкаваньне культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых — зьяўляецца да гэтага часу зусім нездавальняючым.

2. У пастановах чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і таксама ў прамове тав. Сталіна канкрэтна і выразна адзначаны задачы і практычныя мерапрыемствы па культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых. Аднак, з боку партыйных, прафсаюзных і савецкіх арганізацый ёсьць недаацэнка важнасьці санітарнага аздараўленьня прадпрыемстваў і ўпарадкаваньня культ-бытавога абслугоўваньня рабочых.

3. На гледзячы на тое, што санітарнае аздараўленьне прадпрыемстваў і ўпарадкаваньне культурна-бытавых умоў рабочых зьяўляюцца вельмі важнымі фактарамі ў выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну, некаторыя гаспадарнікі не праявілі выстарчальнай ініцыятывы і клопатаў у справе паляпшэньня санітарнага стану прадпрыемстваў і бытавых умоў рабочых і не адчуваюць ніякай адказнасьці за гэтую справу, а таксама і прафсаюзныя арганізацыі не мабілізавалі ўвагі рабочай грамадзкасьці на выкананьне санмінімуму.

4. Не разгарнулі належнай работы ў галіне санітарнага аздараўленьня прадпрыемстваў і ажыцьцяўленьня санмінімуму мясцовыя арганізацыі, як інспэктарыят аховы здароўя і саюз мадэнпрацы; ня ўцягнута ў практычнае ажыцьцяўленьне санмінімуму пралетарская грамадзкасьць.

Выходзячы з вышэйпаказанага, сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Прапанаваць усім гаркомам і райкомам КП(б)Б, а таксама ўсім партыйным арганізацыям неадкладна прыступіць да ажыцьцяўленьня кіраўніцтва справай санітарнага аздараўленьня паасобных прадпрыемстваў, цэхаў, рабочых пасёлкаў, вуліц, інтэрнатаў, устаноў грамадзкага харчаваньня і інш.

2. ЦК ЛКСМ неадкладна ўключыцца ў практычнае ажыцьцяўленьне санмінімуму, шырока прыцягнуўшы да гэтага і піянэрскія арганізацыі.

3. ЦСПСБ, гар. і райпрафсаветам, ФЗМК зараз-жа прыступіць да ажыцьцяўленьня санітарнага мінімуму, разгарнуўшы шырокім фронтам сацыялістычнае спаборніцтва паміж паасобнымі прадпрыемствамі, цэхамі, установамі, рабочымі пасёлкамі, саўгасамі, МТС і г. д.

5. НК Камунальнай Гаспадаркі, гарсаветам, райвыканкомам забясьпечыць у дэкадны тэрмін бесьперабойную работу пазень, і прапень, а таксама прыняць рашучыя захады да забесьпячэньня рабочых пасёлкаў, прадпрыемстваў і месц сэзонных работ добраякаснай вадой, узмоцніць справу ачысткі.

6. НКАЗ сканцэнтраваць усю сваю ўвагу на ажыцьцяўленьні аздаравіцельных мерапрыемстваў на буйных прадпрыемствах, новабудоўлях, торфараспрацоўках і г. д.; больш рашуча і настойліва праводзячы кантроль над ажыцьцяўленьнем санмінімуму, разгарнуць шырока санітарна-асьветную растлумачальную работу (арганізацыя гутарак на заводах, актывізацыя работы дамоў санаховы і габінэтаў, пасылка брыгад у раёны і г. д.).

7. НКАЗ стварыць інстытут опэцыяльных інспэктароў санітарнага нагляду, а таксама ўстанавіць сыстэму грамадзкіх інспэктароў санітарнага нагляду на прадпрыемствах з прадастаўленьнем апошнім адпаведных адміністрацыйных праў. НКЮ, НКАЗ у дэкадны тэрмін распрацаваць палажэньні аб інспэктарох санітарнага нагляду і ўнесьці на зацьвярджэньне СНК БССР.

8. Белжылсаюзу забясьпечыць своячасовую і належную ачыстку домаўладаньняў жактаў, тэрмінова разгарнуць работу па ажыцьцяўленьні санмінімуму па ўсёй сваёй сыстэме, уцягнуўшы ў гэтую справу ўсіх членаў жактаў, жонак, хатніх гаспадынь.

9. Прапанаваць усім рэдакцыям цэнтральных і раённых газэт і фабрычна-заводзкіх шматтыражак неадкладна ўключыцца ў правядзеньне кампаніі па санмінімуме, арганізаваўшы рэйды на прамысловыя прадпрыемствы, інтэрнаты, сталоўкі і г. д.

10. ЦК КП(б)Б папярэджвае ўсе арганізацыі супроць кампанійнага правядзеньня работы па санмінімуме і прапануе арганізаваць барацьбу за санітарнае аздараўленьне, як штодзенную ўпартую і масавую работу па паляпшэньні культурна-бытавога становішча працоўных.

11. Даручыць НКАЗ і аддзелу масавай работы далажыць праз месяц на сакратарыяце ЦК аб санітарным становішчы.

Рыхтавацца да разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах

Прывесьці ў поўную яснасьць запісы працадзён, прадуктаў грошай

Пастанова Калгасцэнтру СССР

Правільнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах па колькасьці і якасьці затрачанай працы магчыма толькі пры ўмове поўнага ўліку як працы, затрачанай кожным калгасьнікам, так і даходаў калгасу.

У адпаведнасьці з гэтым праўленьне КХЦ пастанаўляе:

1. Рэспубліканскім, краявым і абласным калгасаўзам праз свае інструктарскія апараты і райкалгасаюзы:

а) Прывесьці ў поўную яснасьць стан разлікаў па запазычанасьці калгасу розным установам, у тым ліку і па крэдытах;

б) праверыць запісы ў кнізе калгасу ўсёй прадукцыі, выпрацаванай калгасам;

в) праверыць у кнігах запісы зданай калгасамі прадукцыі па кантрактацыі і адлічэньні ў прадугледжаныя для калгасу фонды;

г) арганізаваць поўны ўлік усіх грашовых даходаў калгасу, як ад выручкі па здачы прадукцыі, так і ад іншых даходаў калгасу.

2. Да работы па ўліку прыбыткаў і выдаткаў калгасу і правільнасьці ўліку працы абавязкова павінны быць прыцягнуты рэвізійныя камісіі калгасаў, якім арганізаваць грамадзкі кантроль калгаснікаў над правільнасьцю прыходваньня і выдаткаваньня калгасных прадуктаў і грашовых сродкаў.

3. Арганізаваць у друку шырокую кампанію, якая асьвятляе значэньне ўліку працы і прыбытку калгасу і растлумачвае тэхніку гэтага ўліку.

4. Пры дагаворанасьці з мясцовымі органамі мабілізаваць неабходную колькасьць рахунковых работнікаў у дапамогу калгасам па прывядзеньні ў яснасьць усіх яго рахункаў, абавязаўшы разам з тым работнікаў, якія знаходзяцца ў сёлах і мабілізаваных на збожжазагатоўкі і інш. кампаніі, аказваць поўную садзейнасьць калгасам у прывядзеньні ў яснасьць іх справаздачнасьці.

УСІМ РАЙКОМАМ І РАЙВЫКАНКОМАМ
ЗГАДЖАЮЧЫСЯ З ПРАПАНОВАМІ „ЗЬВЯЗДЫ" (№ 239), ПРАПАНУЕМ НЕАДКЛАДНА СТВАРЫЦЬ КАМІСІІ САДЗЕЙНАСЬЦІ ІМЯ ДАЎЕЦКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ
ЦК КП(б)Б—ГЕИ
СНК БССР—ГРЫСЕВІЧ

Першая партыя ільнавалакна

90 гэкт. ільну ўбрана і разаслана

ВУШАЧЫ. (НАШ КАР.). КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» У СВАІМ ЗВАРОЦЕ ДА ЎСІХ КАЛГАСАЎ ВУШАЦКАГА РАЁНУ АБАВЯЗАЎСЯ ДА 1-га ВЕРАСЬНЯ ЎБРАЦЬ, АБМАЛАЦІЦЬ, ЗАМАЧЫЦЬ І РАЗАСЛАЦЬ 90 ГЭКТ. ІЛЬНУ.

ДЗЯКУЮЧЫ РАЗГОРНУТАМУ ЎДАРНІЦТВУ І САЦСПАБОРНІЦТВУ, БРЫГАДА ІЛЬНАЦЕРАБІЛЬШЧЫКАЎ З 24 ЖАНЧЫН І БРЫГАДА АБМАЛОТЧЫКАЎ-МАЧЫЛЬШЧЫКАЎ З 12 МУЖЧЫН, НА ЧАЛЕ З АДКАЗНЫМІ БРЫГАДЗІРАМІ — Т. Т. ГІРАЎКА МАРЫНАЙ І МІЦКЕВІЧАМ АЛЕСЕМ СЫСТЭМАТЫЧНА ПЕРАВЫКОНВАЛІ НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ.

УСЁ ГЭТА ЗАБЯСЬПЕЧЫЛА ВЫКАНАНЬНЕ ЎЗЯТЫХ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ РАНЕЙ ТЭРМІНУ. НА 26 ЖНІЎНЯ ЛЁН ПОЎНАСЬЦЮ ЎБРАНЫ, АБМАЛОЧАНЫ, ЗАМОЧАНЫ І РАЗАСЛАНЫ, АКРАМЯ ГЭТАГА, ЛЁН З 4 ГЭКТ., ЯКІ БЫЎ ЎБРАНЫ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ, ЎЖО АПРАЦАВАНЫ.

30 ЖНІЎНЯ КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» З ЦЭНТН. ІЛЬНАВАЛАКНА НОВАГА ЎРАДЖАЮ ЗДАЎ ДЗЯРЖАВЕ.

У РАПАРЦЕ НА ІМЯ РАЙКОМА КП(б)Б, РВК І РАЙГАЗЭТЫ, КАЛГАСЬНІКІ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» АБАВЯЗАЛІСЯ СКОНЧЫЦЬ АСЕНЬНЮЮ СЯЎБУ ДА 4 ВЕРАСЬНЯ.

ЛІПАЎКА ЯН.

НІ АДНЭЙ ТОНЫ—

НЕ ПАКІНУЦЬ НА ПОЛІ

Арганізуем узаемадапамогу адстаючым калгасам

5 верасьня — апошні тэрмін уборкі яравых па БССР. Ход уборкі на сёньняшні дзень не забясьпечвае своячасовага выкананьня заданьня і поўнага захаваньня ўраджаю.

На 1 верасьня ўбрана толькі 62,1 ПРОЦ. ЯРАВЫХ.

Паўдзённыя раёны Беларусі павінны былі скончыць уборку яравых яшчэ 25 жніўня.

На 1 верасьня толькі 2 раёны—БРАГІНСКІ І ПАРЫЦКІ — ПОЎНАСЬЦЮ СКОНЧЫЛІ ЎБОРКУ.

КАНЧАЮЦЬ УБОРКУ ЯРАВЫХ БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН (96,9 ПРОЦ.), РЭЧЫЦКІ (89,9 ПРОЦ.), ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ (92,8 ПРОЦ.).

Рэшта паўдзённых раёнаў значна адстае.

Жыткавіцкі, Камарынскі, Лельчыцкі і Тураўскі раёны дагэтуль яшчэ ня ўбралі ваат і паловы яравых пасеваў.

Ня лепш і з ходам уборкі ў цэнтральных раёнах. Такія раёны, як Барысаўскі, Бягомльскі, Менскі і Плешчаніцкі, убралі толькі ад 25 да 38 проц. яравых пасеваў.

Толькі адзін КАПЫЛЬСКІ раён убраў 90,3 проц. пасеваў. Між тым, апошні тэрмін уборкі ўжо прайшоў.

Яшчэ горш ідзе ўборка ў паўночных раёнах. Асьвейскі раён, напрыклад, убраў усяго 19 проц. яравых, Полацкі—24 проц. Адстае і Лепельскі раён, які ўбраў толькі 34 проц.

У радзе калгасаў («Новае жыцьцё», Дубровенскага раёну, «Чырвоны штандар»—Плешчаніцкага) зжатае абожжа ляжыць на полі, не складаецца ў копы і ня звозіцца ў гумны.

Праўленьні гэтых калгасаў за псаваньне ўраджаю трэба прыцягнуць да судовай адказнасьці.

Складваньне ў копы (сьціртаваньне) і звозка ў гумны значна адстаюць ад тэмпаў уборкі, што пагражае стратамі ўраджаю.

У бліжэйшыя-ж дні раёны ПАВІННЫ СКОНЧЫЦЬ УБОРКУ ЯРАВЫХ І ЗВОЗКУ ІХ У ГУМНЫ. Трэба скарыстаць добрае надвор'е і своячасова ўбраць ураджай.

НІ АДНЭЙ ТОНЫ ЗБОЖЖА НЕ ПАВІННА ЗАСТАЦЦА НА ПОЛІ.

Раённыя арганізацыі, у першую чаргу райкалгасаюзы, павінны ўстанавіць штодзенны кантроль за ходам уборкі яравых, арганізуючы сацыялістычную ўзаемадапамогу адстаючым калгасам.

Калгас „Чырвоны баец" чакае дапамогі

ЗАСЛАЎЕ. У нова-арганізаваным калгасе «Чырвоны баец», Бардзінскага сельсавету, не выдаецца ўлік працы калгасьнікаў. Само праўленьне калгасу ня мае выстарчальнага вопыту ў працы, а райкалгасаюз яму не дапамагае.

Праўленьне зьвярнулася ў райкалгасаюз і ў сельсавет з просьбаю дапамагчы наладзіць улік працы і маемасьці. Праўда, сельсавет адгукнуўся на гэтую просьбу. Ён вылучыў брыгаду з трох чалавек: хатніка, рахункавода сельспажыўтаварыства і настаўніка. Але гэта брыгада ўжо больш за месяц, як арганізавана, а ў калгас не заглянула.

У калгасе да гэтага часу няма плянаў сілаваньня і асеньняй сяўбы.

Райкалгасаюз павінен зьвярнуць увагу на калгас «Чырвоны баец». Трэба прымусіць брыгаду выканаць даручаную ёй работу.

Машніцкі.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

аб пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну, ходзе ўборкі і апрацоўкі ільну па раёнах БССР (на 30 жніўня)

НАЗВА РАЁНАЎ	Лік калгас	Перайш. на зьдзельшчыну	Забесьпеч. працадн. кніж.	Пераведз. запіс у кніжка	Выцераб. у проц.	Абмалоч. да выцераб. у проц.	Замоч. і разаслана ў адно. выцер. у проц.
	Лік калгасаў				Уборка ільну ў проц.		
Брагінскі	85	82	84	81	100,0	48,5	48,5
Буда-Кашалёўскі	47	47	40	30	100,0	75,7	75,7
Бабруйскі	135	110	125	80	81,5	92,8	92,8
Веткаўскі	73	65	62	55	100,0	9,2	9,2
Глускі	117	82	110	75	78,6	41,5	41,5
Гомельскі	53	50	40	40	67,0	43,8	43,8
Жыткавіцкі	62	62	62	62	80,2	15,2	15,2
Жлобінскі	108	68	73	68	100,0	49,6	49,6
Кармянскі	136	103	112	103	89,0	—	—
Камарынскі	36	36	36	36	91,7	—	—
Ельскі	76	70	70	42	100,0	100,0	80,2
Лоеўскі	84	76	82	72	100,0	—	—
Любаньскі	45	42	38	—	95,9	36,1	21,3
Лельчыцкі	47	40	35	35	100,0	—	—
Мазырскі	146	131	23	110	99,7	—	—
Нараўлянскі	68	50	32	26	81,3	7,5	—
Парыцкі	103	57	28	12	100,0	47,6	11,1
Пятрыкоўскі	100	63	82	47	99,8	—	—
Рагачоўскі	130	109	109	104	92,7	60,8	—
Рэчыцкі	119	75	75	50	100,0	67,5	50,6
Слуцкі	160	138	110	138	97,8	82,0	27,9
Старобінскі	71	69	58	45	98,7	9,4	9,4
Стара-дароскі	72	64	62	62	80,4	11,7	9,5
Тураўскі	33	29	31	—	69,5	5,8	5,8
Церахаўскі	57	52	45	41	100,0	17,6	17,6
Чачэрскі	44	43	43	43	100,0	93,9	93,9
Чырвонапольскі	112	94	43	12	100,0	41,9	41,9
Чырвона-Слабодзкі	42	35	33	30	87,4	—	—
Уваравіцкі	42	26	35	17	98,5	21,4	18,4
Хойніцкі	86	76	80	68	100,0	25,2	25,2
Асіповіцкі	116	103	108	103	95,8	0,6	0,6
Быхаўскі	163	109	105	75	57,6	3,7	3,7
Барысаўскі	154	137	140	130	81,7	12,1	12,1
Бялыніцкі	147	130	118	112	80,6	—	—
Бягомльскі	139	90	85	82	3,9	—	—
Бярэзінскі	108	79	96	79	100,0	2,4	2,4
Горацкі	208	199	180	178	56,0	4,8	4,8
Заслаўскі	44	42	42	39	50,1	5,1	1,1
Клімавіцкі	105	87	—	—	100,0	33,0	18,4
Крупскі	218	120	119	116	91,0	16,7	16,7
Капыльскі	160	143	130	130	58,6	52,4	28,5
Касьцюковіцкі	266	219	241	252	59,3	21,9	21,9
Клічаўскі	123	100	82	56	100,0	3,6	—
Койданаўскі	115	114	112	112	69,1	—	—
Крычаўскі	96	90	89	89	94,5	23,9	23,0
Лагойскі	98	58	87	64	76,7	—	—
Магілеўскі	162	139	140	—	77,1	—	—
Мсьціслаўскі	202	196	187	187	59,1	6,0	4,4
Менскі	125	85	85	—	40,4	1,4	—
Прапойскі	99	86	50	40	97,0	32,7	27,5
Пухавіцкі	148	141	141	101	82,6	3,1	2,8
Плешчаніцкі	66	61	76	61	31,1	—	—
Смалявіцкі	101	83	101	101	27,2	46,2	37,2
Талачынскі	322	233	224	195	64,8	16,2	16,2
Чэрвенскі	81	73	73	73	98,5	25,4	18,8
Чавускі	201	169	107	82	23,3	18,8	18,8
Чэрыкаўскі	116	92	75	61	74,2	20,7	18,1
Шклоўскі	187	176	167	167	96,3	54,1	2,6
Рэзьдзенскі	75	69	68	55	76,5	40,9	7,5
Асьвейскі	62	62	21	7	38,7	64,9	64,9
Аршанскі	334	245	215	245	64,4	31,2	23,1
Бешанковіцкі	247	157	150	117	44,6	89,1	89,1
Віцебскі	140	138	103	97	29,2	15,2	15,2
Вушацкі	145	136	136	136	79,3	—	—
Гарадоцкі	374	235	—	—	96,0	30,6	29,4
Дубровенскі	176	135	147	135	77,5	80,3	21,5
Дрысьенскі	175	103	112	94	50,0	85,5	68,2
Лёзьнянскі	205	173	185	147	97,2	29,8	28,3
Лепельскі	123	120	120	117	76,7	12,9	12,9
Полацкі	222	158	145	113	34,3	63,6	63,6
Расонскі	79	70	74	56	78,2	100,0	100,0
Сураскі	174	138	121	118	96,1	47,5	47,5
Сеньненскі	261	247	215	192	84,1	13,3	13,3
Сіроцінскі	235	214	219	—	79,3	34,9	33,4
Чашніцкі	197	165	190	107	46,7	18,4	18,4
У

АБ ВЫДАВЕЦКАЙ РАБОЦЕ

Гігацкі рост палітычнага і культурнага ўзроўню рабочых і калгасьнікаў, які адбываецца на аснове ўмацаваньня і пашырэньня матар'яльнай базы сацыялізму, прад'яўляе ўсё новыя патрабаваньні на кнігу ва ўсіх галінах ведаў.

Выключна вырасла патрабаваньне ў творах клясыкаў марксізму; задачы выхаваньня новых кадраў патрабуюць павялічэньня выпуску вучэбнай літаратуры; уздым актыўнага палітычнага жыцьця новых пластоў працоўных павялічвае попыт на масавую палітычную кнігу; асабліва ўзрастае ў перыяд сацыялістычнай рэканструкцыі патрабаваньне ў тэхнічнай літаратуры розната кшыру; разгортваньне культурнай рэвалюцыі павышае выхавачую ролю масавай літаратуры.

За апошнія гады ў выдавецкай літаратуры дасягнуты значныя дасьпехі як колькасныя, так і якасныя: прадукцыя «ОГИЗ» (улічваючы і выдавецтвы, якія зараз увайшлі ў «ОГИЗ») узрасла з 300 млн. экз. у 1929 годзе да 575 млн. экз. у 1930 годзе, у 1931 годзе прадукцыя «ОГИЗ» узрастае да 800 млн. экз. Выданьне твораў Леніна ў бягучым годзе павінна складсьці каля 5 млн. экз., г. зн. у 2 разы больш, чым у 1930 годзе; выданьне тэхнічнай кнігі павялічваецца да 40 млн. экз. супроць 11 млн. у мінулым годзе; літаратуры для ўсіх відаў школ і па-зашкольнага навучаньня за апошнія два гады выдана каля 150 мільёнаў экз.; шырока разгарнулася выданьне масавай літаратуры, у асаблівасьці сельска-гаспадарчай.

Разам з тым, ЦК УсеКП(б) лічыць, што ўздым выдавецкай справы адстае ад шпарка ўзрастаючых патрабаваньняў на кнігу, у асаблівасьці з павялічэньнем пралетарыяту і яго культурным ростам, разгортваньнем калгаснага руху, стварэньнем кадраў пралетарскай інтэлігенцыі. У самай выдавецкай справе ёсьць недахопы, якія перашкаджаюць своячасоваму і правільнаму здавальненьню культурных запатрабаваньняў; выданьне клясыкаў марксізму відаецца ў невыстарчальных тыражох; работа па стварэньні тэхнічнай і вытворчай літаратуры разгортваецца з вялікім спазьненьнем і недапушчальна марудна; выдавецтвы не праяўляюць патрэбнай актыўнасьці ў прыцягненьні і арганізацыі аўтарскіх кадраў; якасьць кнігі таксама ніяк значна адстае ад сур'ёзных патрабаваньняў, якія прад'яўляюцца кнізе, што тлумачыцца як невыстарчальнай увагай выдавецтва да гэтага пытаньня, так і дрэнным падборам рэдактарскіх кадраў; кнігараспаўсюджаньне пастаўлена бюракратычна і не здавальняе своячасова і правільна попыту на кнігу.

Барацьба за далейшы ўздым культуры шырокіх працоўных мас, за выхаваньне кожнага рабочага і калгасьніка, як змагара за сацыялізм, высоўвае перад выдавецтвамі рад вялікіх і новых задач.

Выдавецтвы павінны своячасова ўлічваць патрабаваньне ў кнізе з боку розных пластоў рабочых, калгасьнікаў, інтэлігенцыі і ручнаў розных спэцыяльнасьцяй і кваліфікацый і дыфэрэнцыявана абслугоўваць іх.

Характар і зьмест кнігі павінны цалкам адказваць задачам сацыялістычнай рэканструкцыі; кніга павінна быць баявой і актуальна-палітычнай, яна павінна ўзброіць найшырэйшыя масы будаўнікоў сацыялізму марксыцка-ленінскай тэорыяй і тэхніка-вытворчымі ведамі. Кніга павінна зьявіцца магутнейшым сродкам выхаваньня, мабілізацыі і арганізацыі мас вакол задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва; якасьць кнігі павінна адказваць усё ўзрастаючым культурным запатрабаваньням мас.

Тыл кнігі, яе зьмест, мова павінны адказваць спэцыяльнаму прызначэньню яе, узроўню і патрабаваньням тай групы чытачоў, для якіх яна прызначана.

1. Арганізацыя выдавецкай справы

З прычыны таго, што масавая прапаганда марксыцка-ленінскай тэорыі набывае ўсё большае значэньне, а таксама з прычыны важнасьці на даным этапе задач аўладаньня тэхнікай і пашырэньня тэхнічных ведаў, — гэтыя віды літаратуры павінны быць пастаўлены ў асобнае становішча.

ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

1. Вылучыць з сыстэмы «ОГИЗ» дзяржаўнае тэхнічнае выдавецтва («Гостехиздат»), перадаўшы яго ў веданьне ВСНГ.

2. Вылучыць з сыстэмы «ОГИЗ» масавае партыйнае выдавецтва («Масспартиз») і з дзяржаўнага выдавецтва сацыяльна - эканамічнай літаратуры («Соцэкгиз»), выданьне масавай партыйнай і тэарэтычнай літаратуры па марксызьме-ленінізьме, стварыўшы выдавецтва партыйнай літаратуры («Партиздат»), якое знаходзіцца пад непасрэдным кіраўніцтвам Культпропу, ЦК УсеКП(б).

3. Рэарганізаваць дзяржаўнае выдавецтва сацыяльна-эканамічнай літаратуры ў дзяржаўнае выдавецтва эканамічнай літаратуры, сканцэнтраваўшы ў ім выданьне спэцыяльнай эканамічнай літаратуры, літаратуры па пытаньнях эканамічнай геаграфіі, па працы, калгасарцы і забесьпячэньні, эканоміцы паасобных галін гаспадаркі, а таксама эканамічных падручнікаў. Пакінуць гэта выдавецтва ў сыстэме «ОГИЗ».

4. З прычыны таго, што на мясцох, як правіла, ужо ёсьць неабходныя ўмовы для разгортваньня праз мясцовый нац. выдавецтвы выданьня літаратуры па нацыянальных мовах, а таксама для прыцягненьня да абслугоўваньня літаратурай наименшасьцяй матучнай матар'яльнай і арганізацыйнай базы «ОГИЗ» і буйнейшых спэцыялізаваных выдавецтваў, — перабудаваць справу выданьня літаратуры на

НЯ СПЫНЯЦЬ здабычы торфу

ВЫКАНАНЬНЕ СЭЗОННАГА ПЛЯНУ ТОРФАЗДАБЫЧЫ (У ПРОЦ.)

27 ЖНІЎНЯ	28 ЖНІЎНЯ
49,0	49,2
29 ЖНІЎНЯ	**30 ЖНІЎНЯ**
49,5	49,8

31 ЖНІЎНЯ

50,2

ПА 22-х ЗАВОДАХ БЕЛТОРФУ НА 1 ВЕРАСЬНЯ ЗДАБЫТА 351.407,1 ТОНЫ ТОРФУ, ШТО СКЛАДАЕ 50,2 ПРОЦ. ПРАГРАМЫ 1931 ГОДУ.

У ПАРАЎНАЛЬНІ СА ЗДАБЫЧАЙ МІНУЛАГА ГОДУ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ТАРФЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ БССР ДАБІЛАСЯ РЭЗКАГА ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ. АЛЕ ГЭТА НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЯ ЗНІМАЕ АДКАЗНАСЬЦІ З БЕЛТОРФУ Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ, ЗА ТОЙ ПРАРЫЎ, ЯКІ ДАПУШЧАНЫ Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ Ў ПРАГРАМЕ ТОРФАЗДАБЫЧЫ.

ГЭТЫ ПРАРЫЎ ПАВІНЕН ПАСЛУЖЫЦЬ РАШУЧЫМ СЫГНАЛАМ ДЛЯ БЕЛТОРФУ, ЯКІ З-ЗА ДРЭННАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ВЕЛЬМІ ПОЗНА РАСПАЧАЎ СЭЗОН ТОРФАЗДАБЫЧЫ І НЯ ЗМОГ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ ТОРФАЗДАБЫЧЫ.

ЗАРАЗ ІДЗЕ ТОЛЬКІ ФРЭЗЭРНАЯ ЗДАБЫЧА ТОРФУ. ІНШЫЯ ВІДЫ ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ СПЫНЕНЫ.

У ВЫНІКУ З 1-га ВЕРАСЬНЯ ПРАЦУЕ ТОЛЬКІ 14 ТОРФАЗАВОДАЎ. НАСТУПНЫЯ ЗАВОДЫ: «ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК», «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ», ІМЯ ДАЎМАНА, «ГРЭБЯНЁВА», «ДАВЫДАЎКА» «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ», «РЭМІЗАВА» І «СМАЛЯВІЧЫ» ЗУСІМ СПЫНІЛІ РАБОТУ ПА ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ.

З ІХ ТОЛЬКІ ДВА ЗАВОДЫ «ЧЫРВОНЫ ТАРФЯНІК» І «ЗАКРАШЫНСКІ МОХ» ДАТЭРМІНОВА СКОНЧЫЛІ СЭЗОН І ПЕРАКЛЮЧЫЛІ СІЛЫ ТАРФЯНІКАЎ І ТАРФЯНІЦ НА СУШКУ, УБОРКУ І ВЫВАЗКУ ЗДАБЫТАГА ТОРФУ.

АСТАТНІЯ 6 ЗАВОДАЎ СПЫНІЛІ ЗДАБЫЧУ ТОРФУ, НЕ ДАДАЎШЫ КРАІНЕ НЕКАЛЬКІ ДЗЕСЯТКАЎ ТЫСЯЧ ТОН ТАРФЯНОГА АПАЛУ. ТАК, «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ» ЗДАБЫЎ ТОЛЬКІ 7.321,4 ТОНЫ ТОРФУ, АБО 30,5 ПРОЦ. СЭЗОННАГА ЗАДАНЬНЯ, «СМАЛЯВІЧЫ» ЗДАБЫТА 3.109,4 ТОНЫ ТОРФУ, ШТО СКЛАДАЕ 31 ПРОЦ. ГАДАВОЙ ПРАГРАМЫ І «РЭМІЗАВА», ДЗЕ ЗДАБЫТА ЎСЯГО 1.927,8 ТОНЫ, АБО 9,8 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

ТЭМПЫ РАБОТЫ 14 ЗАВОДАЎ, ЯКІЯ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ФРЭЗЭРНУЮ ЗДАБЫЧУ ТОРФУ, ВЕЛЬМІ СЛАБЫЯ. НЕДАПУШЧАЛЬНА АДСТАЮЦЬ БУЙНЕЙШЫЯ ТОРФАЗАВОДЫ «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ І «АСІНТОРФ».

НАПЕРАДЗЕ ІДУЦЬ «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», «БАЛЬШАВІК» І «НОВАЯ БЕЛАРУСЬ».

У ПЕРАВАЖНАЙ БОЛЬШАСЬЦІ ТОРФАЗАВОДАЎ ЗУСІМ СЛАБА РАЗГОРТВАЕЦЦА РАБОТА ПА СУШЦЫ, УБОРЦЫ І ВЫВАЗЦЫ ЗДАБЫТАГА ТОРФУ.

ТАК, З-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ПАТРЭБНАЙ КОЛЬКАСЬЦІ ТАРФЯНОГА АПАЛУ ПАСТАЎЛЕНА ПАД ПАГРОЗУ НАРМАЛЬНАЯ РАБОТА БАРЫСАЎСКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ.

НА ТОРФАЗАВОДЗЕ «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», ЯКІ ЗАБЯСПЕЧВАЕ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЮ АПАЛАМ, ЕСЬЦЬ ЗАПАС ГАТОВАГА ТОРФУ Ў 10 ТЫС. ТОН. АДНАК, НІ ТОРФАЗАВОД «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», НІ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ НЯ ЎЖЫВАЮЦЬ РАШУЧЫХ ЗАХАДАЎ ДЛЯ ТАГО, КАБ РАЗГАРНУЦЬ ПА-БАЯВОМУ ВЫВАЗКУ ГЭТАГА ТОРФУ І ГЭТЫМ САМЫМ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНУЮ РАБОТУ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ.

ПАДОБНАЕ СТАНОВІШЧА І НА ТОРФАЗАВОДЗЕ «ГРЭБЯНЁВА». МАГІЛЕЎСКІ ВАЛАКНАБУД, ЯКІ ЗАБЯСПЕЧВАЕЦЦА ТАРФЯНЫМ АПАЛАМ, НЯ ПРЫМАЕ НІЯКІХ ЗАХАДАЎ ПА ДАПАМОЗЕ ТОРФАЗАВОДУ «ГРАБЯНЁВА» Ў ВЫВАЗЦЫ ТОРФУ.

ВЕРАСЕНЬ МЕСЯЦ ПАТРЭБНА СКАРЫСТАЦЬ ДЛЯ САПРАЎДЫ ФАРСАВАНАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ СУШКІ, УБОРКІ І ВЫВАЗКІ ЗДАБЫТАГА ТАРФЯНОГА АПАЛУ.

ДАЦЬ ІНТЭРНАТЫ 2.000 СТУДЭНТАЎ

Лесбел, НКА, Дзяржплян замест будаўніцтва баракаў займаюцца цыркулярнай пісанінай

ДА 1-га КАСТРЫЧНІКА ПАБУДАВАЦЬ БАРАКІ, ПЕРАВЕСЬЦІ ПААСОБНЫЯ ІНСТЫТУТЫ НА ДВУХЗЬМЕННУЮ РАБОТУ —БЛЯВАЯ ЗАДАЧА ДНЯ

НІ АДНЭЙ МІНУТЫ МАРУДНАСЬЦІ!

Да 1 кастрычніка ўсе ВНУ і тэхнікумы павінны поўным ходам разгарнуць заняткі.

Гэта патрабуе напружанай, балевой падрыхтоўчай работы як па лініі камплектаваньня, так і па цэлым радзе іншых мерапрыемстваў.

З АСАБЛІВАЙ СІЛАЙ прыходзіцца ставіць пытаньне аб забесьпячэньні інтэрнатамі студэнтаў сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў. ТУТ СТАНОВІШЧА САПРАЎДЫ КАТАСТРАФІЧНАЕ.

У гэтым годзе арганізаваны новыя тэхнікумы і ВНУ. Значна пашыран набор ва існуючыя раней навучальныя установы. У выніку рэарганізацыі БДУ і горацкай С.-Г. Акадэміі выпучана шмат новых Інстытутаў.

У сувязі з гэтым выявілася ВЯЛІЗАРНАЯ РАЗЬБЕЖКА паміж колькасьцю студэнтаў і жыльлёвымі магчымасьцямі —інтэрнатамі.

Па недакладных падліках не хапае інтэрнатаў для 3 тыс. студэнтаў. Калі ня будзе ліквідаван жыльлёвы прарыў, НЯ БУДУЦЬ СВАЯЧАСОВА ПАЧАТЫ ЗАНЯТКІ ў важнейшых ва ўмовах БССР ВНУ.

Пагроза зрыву навучаньня ў гэтых ВНУ ЗУСІМ РЭАЛЬНАЯ. Будаўніцтва інтэрнатаў па сутнасьці ЯШЧЭ НЕ РАСПАЧАТА. Прайшло шмат часу пасьля пастановы ўраду аб будаўніцтве 10 барачнага тыпу інтэрнатаў, але апрача міжведамственнай цыркулярнай «чэхарды» паміж НКА, Дзяржплянам і Лесбелам нічога пакуль што няма.

ВСНГБ, пад ведамам якога знаходзіцца шмат інстытутаў, у свой час таксама вынес пастанову аб пабудове 15 дамоў стандартнага тыпу пад інтэрнаты для студэнтаў. АДНАК, БУДАЎНІЦТВА ЯШЧЭ НЕ РАСПАЧАТА. Надзвычай марудна ажыцьцяўляецца пастанова аб разгрузцы гор. Менску ад некаторых установ з пераводам іх у іншыя гарады БССР.

СТАНОВІШЧА З ЖЫЛЬЛЁВЫМ БУДАЎНІЦТВАМ ДЛЯ СТУДЭНЦТВА НАПРУЖАНАЕ. Тут справа ўпіраецца ня толькі ў непаваротлівасьць паасобных установ, у недаацэнку гэтага роду будаўніцтва, у недахват будаўнічых матар'ялаў, але і ў НАДЗВЫЧАЙ КАРОТКІ ТЭРМІН, што застаўся да пачатку навучаньня.

Патрэбна ГЕРАІЧНАЕ НАПРУЖАНЬНЕ СІЛ, МАБІЛІЗАЦЫЯ ЎВАГІ ЎСЁЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ, САМАЯ ВЯЗЬЛІТАСНАЯ БАРАЦЬБА з недаацэнкай гэтай работы. Прарыў ва што-б там ні было ПАВІНЕН БЫЦЬ ЛІКВІДАВАН, а студэнцтва — забясьпечана інтэрнатамі.

Гэта работа павінна ісьці па двох напрамках:

Па-першае, НЕАБХОДНА ПАБУДАВАЦЬ БАРАКІ. Будаўнічыя арганізацыі павінны праявіць максымальную пунктуальнасьць і НАСТОЙЛІВАСЬЦЬ у гэтай рабоце. Тэрмін ЗУСІМ МАЛЫ, таму імкненне тэмпы будаўніцтва павінны быць МАКСЫМАЛЬНА ВЫСОКІМІ.

Прафсаюзныя, камсамольскія і ў першую чаргу мясцовыя партыйныя арганізацыі абавязаны гэтую работу ўзяць ПАД ШТОДЗЕННЫ КАНТРОЛЬ. І ня толькі кантроль. ТРЭБА МАБІЛІЗАВАЦЬ КАМСАМОЛЬЦАЎ, РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ — БУДАЎНІКОЎ, МАБІЛІЗАВАЦЬ ПАРТЫЙЦАЎ ДЛЯ НЕПАСРЭДНАЙ РАБОТЫ НА БУДАЎНІЦТВЕ ІНТЭРНАТАЎ.

Асаблівыя патрабаваньні ў сувязі з гэтым пред'яўляюцца партыйным, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям тых установаў, якія павінны забясьпечыць будаўніцтва адпаведнымі матар'ялам.

БЕСЬПЕРАБОЙНАЯ ДАСТАЎКА МАТАР'ЯЛАЎ — ВЫРАШЫЦЬ СПРАВУ БУДАЎНІЦТВА.

Па-другое, трэба ажыцьцявіць ПРЫНЦЫП ДВУХЗЬМЕННАЙ РАБОТЫ. Такія інстытуты, як фінансавы і плянавы, каапэрацыйны і савецкага права, педагагічны і інш.—З ПОСЬПЕХАМ могуць перайсьці часова на двухзьменную работу з тым, каб плошчу, якая асабаніцца, ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАРЫСТАЦЬ ПАД ІНТЭРНАТЫ.

Ініцыятыва, якую праявіла БАН, пакуль што ні адной з установ НЕ ПАДХОПЛЕНА.

МЫ маем рацыю зараз ПАТРАБАВАЦЬ ад БДУ і цэлага раду інстытутаў ТЭРМІНОВА заняцца пытаньнем пераводу іх работы на 2 зьмены.

НАПРУЖАНЬНЕМ сіл партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, МАБІЛІЗАЦЫЯЙ ЭНЭРГІІ ўсёй савецкай грамадзкасьці ЗАБЯСПЕЧЫМ ліквідацыю прарываў у жыльлёвым будаўніцтве для студэнтаў.

250 фабзайцаў— бяз інтэрнату

Пачатак навучальнага году ФЗВ пры Бабруйскім камбінаце зрываецца. Інтэрнаты яшчэ не адрамантаваны. Ня гледзячы на тое, што ня так даўно былі вынесены пастановы заўкому і бюро партканклетыву аб хутчэйшым скончаньні рамонту памяшканьняў для ФЗВ, адміністрацыя заводу ў асобах дырэктара і яго намесьніка злачынна ігнаруе гэтыя пастановы.

250 ФАБЗАЙЦАЎ ЗАСТАЛІСЯ БЯЗ ІНТЭРНАТУ, ШТО СТВАРАЕ ПАГРОЗУ ЗРЫВУ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ. Апрача гэтага адміністрацыя не паклапацілася, каб забясьпечыць ФЗВ належнымі кадрамі інструктароў і настаўнікаў. Дагэтуль у ФЗВ яшчэ няма загадчыка.

Зрыўшчыкі навучальнага году павінны быць аддаены пад суд.

С. ДАЛЬНЫ.

КАНВЭЕР ЦЯГАНІНЫ

У пастанове ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да навучальнага году гаворыцца:

«РК КП(б)Б і НКА мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, а таксама ўвагу і сродкі грамадзкасьці вакол школьнага будаўніцтва. Прыраўняць школьнае будаўніцтва да першачарговага».

Здаецца, што такая пастанова партыі павінна была-б зрабіць круты пералом у пытаньні школьнага будаўніцтва, асабліва ў паўрамку забясьпячэньня вучнёўства сямігодак і студэнцтва сярэдніх і вышэйшых навучальных установаў інтэрнатамі. Аднак, становішча з будаўніцтвам інтэрнатаў па сёнешні дзень пагражаючае.

У жніўні месяцы ўрадавая камісія вынесла пастанову аб пабудове 10 інтэрнатаў барачнага тыпу для 1.000 чалавек студэнтаў. У Гомелі вырашана будаваць тры баракі, у Віцебску — 3, у Менску — 4.

На аснове пастаноў урадавай камісіі Дзяржплян павінен быў забясьпечыць будаўніцтва належнымі будаўнічымі матар'ялам.

З гэтага часу і пачалася **габінэтная перапалка** паміж НКА, Дзяржплянам і Лесбелам. НКА піша ў Дзяржплян, Дзяржплян — у Лесбел, Лесбел — зноў у Дзяржплян і так без канца. **Але канкрэтных вынікаў у гэтай рабоце няма.**

Пабудова 10-ці інтэрнатаў барачнага тыпу яшчэ не распачата. І гэта ня гледзячы на тое, што праз 3 тыдні пачынаюцца заняткі.

Паводле вестак НКА, трэба сказаць, даводі недакладных, 2.000 студэнтаў ня будуць забясьпечаны інтэрнатамі. Прычым тут ня ўлічваецца тая колькасьць студэнтаў, якая будзе прынята дадаткова ў сувязі з рэарганізацыяй БДУ ў асобныя інстытуты, а гэта павялічвае колькасьць амаль у два разы.

Ня лепшая справа і з забясьпячэньнем інтэрнатамі і па лініі ВСНГ. У надзвычай катастрафічным становішчы знаходзіцца хэміка-тэхналёгічны тэхнікум, з якога 300 чалавек не забясьпечаны інтэрнатамі. Прэзыдыум ВСНГ парашыў будаваць баракі, але да работы яшчэ ня прыступлена. Не хапае таксама інтэрнатаў у гомельскім механічным, Менскім тарфяным інстытутах. ВСНГ вызначыў пабудаваць 15 стандартных дамоў для 3.000 чалавек студэнтаў. **Дагэтуль яшчэ будаўніцтва не распачата.**

Па лініі школьнага будаўніцтва ёсьць значны прарыў. Па Менскім раёне шмат дзяцей школ пацменшасьцей ня будуць забясьпечаны інтэрнатамі. Прэзыдыум гарсавету адкрыў інтэрнат пры польскай школе ўсяго на 20 чалавек.

Такое становішча з забясьпячэньнем інтэрнатамі ставіць **пад пагрозу пачатак навучальнага году ва многіх сярэдніх і вышэйшых навучальных установах.**

Трэба неадкладна мабілізавацца па ліквідацыю гэтага прарыву і забясьпечыць найхутчэйшае скончэньне будаўніцтва і рамонт інтэрнатаў.

С. С.

Недаацэнілі значэньня школьнага будаўніцтва

БЕЛТА. Пры Культпропе Аршанскага райкому КП(б)Б адбылася нарада па пытаньні аб падрыхтоўцы да навучальнага году. Дырэктыва ЦК аб скачаковым і ўдарным скончаньні рамонту школ і школьных інтэрнатаў ня выканана. Асабліва вялікі прарыў па лініі будаўніцтва вясковых школ. Некаторыя сельсаветы, а таксама будаўнічыя арганізацыі недаацанілі значэньня школьнага будаўніцтва. З гэтай прычыны навучальны год у паасобных сельсаветах 1 верасьня не пачаты.

Ня лепшая справа і з камплектаваньнем. Напрыклад, у педтэхнікум трэба прыняць 120 чалавек, заяў ёсьць 90. На педкурсы трэба прыняць 120 асоб, заяў — 15. Такое-ж самае становішча пагладзеецца і ў масатэхнікуме і ў некаторых чыгуначных школах. Гэта ў значнай меры тлумачыцца тым, што прафарганізацыі, камсамол, дый самі школы не займаліся пытаньнямі падрыхтоўкі да навучальнага году. Камсамольская арганізацыя ня выканала дырэктывы ЦК ЛКСМБ аб мабілізацыі камсамольцаў у педтэхнікумы і на педкурсы.

У галіне ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыі пісьменнасьці райспэнтарыят народнай асьветы і саюз працаўнікоў асьветы праяўляюць апартуністычную бязьдзейнасьць. Яшчэ лагэтуль няма вынікаў перапісу дзяцей школьнага ўзросту.

„НІВОДНАГА ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ“

Прымусіць кулака выканаць цьвёрдыя заданьні

РАЗГОРТВАНЬНЕМ НАЙШЫРЭЙШАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ ВЫВЕДЗЕМ АДНААСОБНЫ СЭКТАР З ТЫЛУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

Тэмпы нездавальняючыя

Скончыўся жнівень — першы месяц збожжазагатовак. Ад разгортваньня тэмпаў загатовак у жніўні залежыць посьпех усёй збожжазагатоўчай кампаніі. Паводле апошніх даных, да 1-га верасьня гадавы плян збожжазагатовак выканан на 7,9 проц. Да 25-га жніўня было здана 3,9 проц. гадавога пляну. 6-я пяцідзёнка жніўня дала такім чынам, некаторае ўзмацненьне тэмпаў у здачы збожжа.

Упераадзе па здачы збожжа ідуць калгасы БССР.

Калгасы пры МТС выканалі 9,2 проц. гадавога пляну, іншыя калгасы здалі збожжа 10,6 проц. Наогул гадовы плян па калгасыстэме выканан у разьмеры кала 9 проц..

У выніку недаацэнкі здачы збожжа аднаасобным сэктарам індывідуальная бяднацка-серадняцкія гаспадаркі здалі толькі 2,6 проц. гадавога пляну. Вельмі слаба ідзе рэалізацыя кантрактацыйных дагавароў па збожжы. Лічба «0,9 проц.» сьведчыць аб адсутнасьці ўсякай работы ў гэтай галіне.

Выключна дрэнна здаецца збожжа па цьвёрдых заданьнях: да 1-га верасьня здана кала 700 тон; кулацка-заможныя гаспадаркі сабатуюць здачу збожжа, рашучыя меры да іх ня прыняты, ні адзін раён ня даў вестак аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў.

Амаль не прыступілі да загатовак саўгасы БССР. Пляны здачы збожжа яшчэ не даведзены да саўгасаў. Зноў паўтараюцца летаўшія памылкі, калі не аддавалі ніякай увагі ходу збожжазагатовак па саўгасах, лічачы, што «саўгаснае збожжа само пацячэ ў засекі».

Тэмпы збожжазагатовак павінны быць рашуча ўзмоцнены. Плян здачы збожжа зусім рэальны, ён павінен быць поўнасьцю выканан.

Не падрыхтаваліся да сустрэчы абозаў

ЛОЕЎ. (Наш кар.). Нядаўна адбылася нарада старшынь сельсаветаў і старшынь праўленьняў калгасаў па пытаньні загатовак. На нарадзе старшыні калгасаў заключылі паміж сабою сацыялістычныя дагавары на датэрміновую здачу ліпкаў.

23-га жніўня ў м. Лоеў зьехаліся вялікія чырвоныя абозы з калгасаў. Але раённыя арганізацыі не падрыхтаваліся да сустрэчы абозаў, не мабілізавалі вакол гэтай справы грамадзкай думкі. Культабслугоўваньне здатчыкаў ня было наладжана. Ніхто не паклапаціўся аб тым, каб даць калгаснікам гарбату і абед. Абозы прыбылі ў нядзелю, калі маса сялян прыехала на рынак, між тым, раённыя арганізацыі не правялі нават лятучага мітынгу, прысьвечанага здачы збожжа.

Л. Карпенка.

Калгасы—у авангардзе загатовак

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). З пачатку кампаніі збожжазагатовак па раёне былі арганізаваны 3 чырвоныя абозы калгасаў, якія з посьпехам скончылі ўборку збожжа і прыступілі да абмалоту.

Па сельсаветах раз'ехаліся ўпаўнаважаныя РК і РВК, якія павінны дабіцца поўнага выканаяньня пляну загатовак. Арганізаваны чырвоныя абозы са збожжам, зьнятым з «гектараў абароны», якіх на раёне налічваецца 47 га.

А. КАЗІМІРАЎ.

Сустрэчныя пляны здачы збожжа

БЯЛЫНІЧЫ. (Наш кар.). Цярэпынскі сельсавет, які да тэрміну пачаў здачу сельгаспадатку, паказаў ударную работу і ў галіне збожжазагатовак. На апошнім пленуме сельсавету быў высунут сустрэчны плян збожжазагатовак, які на 25 проц. перавышае кантрольнае заданьне.

Члены сельсавету абавязаліся зрабіць усё магчымае, каб поўнасьцю выканаць плян загатовак. Удзельнікі пленуму, паехаўшы на месцы, павялі масава-растлумачальную работу пад лёзунгам «Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку».

БУРНОСАЎ і КАЗЛОЎ.

* *

БАБРУЙСК. (БЕЛТА). Міхалеўскі сельсавет, Бабруйскага раёну, арганізаваў 30 жніўня самы вялікі ў раёне чырвоны абоз у 170 фурманак са збожжам. Сельсавет высунуў сустрэчны плян збожжазагатовак, які на 50 проц. перавышае заданьне.

Гадавы плян здачы сена выканан сельсаветам на 200 проц. Здана мяса 120 проц. заданьня.

Загатоўкі праходзяць на аснове сацспаборніцтва паасобных калгасаў і бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

* *

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Раённая нарада старшынь сельскіх спажывецкіх таварыстваў разам з праўленьнем райспажыўсаюзу высунула сустрэчны плян збожжазагатовак, які на 200 тон перавышае заданьня. Нарада пастановіла выканаць пляны загатовак раней тэрміну і выклікала на сацспаборніцтва Дубровенскі райспажыўсаюз.

23-га жніўня ў горад прыбыў другі вялікі чырвоны абоз, які здаў 10 тон жыта і звыш 1 тоны ячменю. Найбольшую колькасьць збожжа здалі калгасы «ОРКА» і «ШЛЯХ ПРАЛЕТАРЫЯТУ».

Перавыканалі плян здачы сена

БАБРУЙСК. (БЕЛТА). КАМАРОЎСКІ І НОВА-ДВОРСКІ СЕЛЬСАВЕТЫ НА АСНОВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ КАЛГАСЫНКАЎ, БЕДНЯКО, І СЕРАДНЯКОЎ—АДНААСОБНІКАЎ І РАШУЧАГА НАЦІСКУ НА КУЛАЦКІЯ ГАСПАДАРКІ ВЫКАНАЛІ НА 20-га ЖНІЎНЯ ГАДАВЫ ПЛЯН СЕНАЗАГАТОВАК НА 106%. ЗУСІМ НЕ ПРЫСТУПІЛІ ДА ЗДАЧЫ СЕНА ЖЫЦІНСКІ І ПАСЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТЫ.

СЛУЦАК. (БЕЛТА). Гадавы плян сеназагатовак выканан па раёне на 63 проц. Упераадзе ідуць Івана-Гароднецкі сельсавет, які пры заданьні ў 32 тоны здаў 62,5 і Бокшыцкі, які замест 73 тон загатовіў 81 тону.

Шашчынскі сельсавет выканаў заданьне толькі на 8 проц., Першамайскі—на 15 проц.

ФАШЫСЦКАЯ ПРЭСА Ў ЗАМЯШАНЬНІ

Фашысцкая прэса, асабліва віленская, а прычыны масавага ўцяканьня сялян у БССР, захлёбваецца ад дзікага выцьця па Савецкі Саюз. Уся дэфэнзыўная агітацыя аб жахах калектывізацыі, аб прымусовым загаляньні сялян у калгасы і г. д., як бачым, пайшла на нішто і дала адваротныя рэзультаты. Факт масавага пераходу сялянства Заходняй Беларусі ў БССР гаворыць сам за сябе. Ён сьведчыць, што наперакор антысавецкай агітацыі усёй дэфэнзыўнай арміі, сымпатыі працоўных мас Зах. Беларусі, ды не ў адной толькі Зах. Беларусі, а ва ўсёй Польшчы, да Савецкага Саюзу растуць, і няма тэй сілы, якая-б спыніла гэты рост. Гэтыя сымпатыі да адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы растуць разам з эканамічным ростам Савецкага Саюзу, з посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва. Фашысты зараз пераканаліся ў гэтым на практыцы і гэта павінна быць ім урокам і перасьцярогай у выкідку іх узброенага нападу на СССР.

Спачатку фашысцкая прэса замоўчала факт уцяканьня сялян у Савецкі Саюз. Але ў далейшым, калі перабежкі набылі масавы характар і калі фашысцкая ўлада ўбачыла, што гэтага факту ёй не ўтаіць ад шырокіх працоўных мас, дык па загадзе зьверху, як на камандзе, фашысцкія пісакі завылі аб пабіўшай усім аскому «бальшавіцкай агітацыі», аб подкупах, аб «вярбовачных бюро», якія нібы адпраўлялі сялян у СССР і нават аб «прымушэньні ісьці ў СССР». Усёй агітацыі хлусьні, усяго бруду, якімі зараз абліваецца Савецкі Саюз, не пералічыць.

Аднак, ва ўсёй антысавецкай кампаніі фашысцкіх борзапісцаў праглядвае тонка абдуманая, загадзя падрыхтаваная плянавая кампанія, якая мае на мэце, шляхам высмактаных з пальца розных нябыліц пакінуць «прымусовай працы», пасылкі перабежчыкаў на «прымусовыя работы», арыштаў перабежчыкаў ДПУ і г. д. — падарваць сымпатыі сярод працоўных мас Польшчы да Савецкага Саюзу. А што гэта так, дык найлепш за ўсё сьведчаць паведамленьні фашысцкай прэсы.

Так, у першым паведамленьні віленская прэса ад 22 жніўня пісала:

«Ад пэўнага часу ў пагранічных гмінах Дзісьненскага павету пашырыліся чуткі аб наборы савецкай упадай значнай колькасьці кваліфікаваных і некваліфікаваных рабочых на выезд у СССР, нібы на работы пры пабудове дамоў, на Дняпрабудзе і на капальні золата на Урале.

З прычыны такой агітацыі ў апошнія дні пачалі паўтарацца выпадкі нелегальнага пераходу граніцы з Польшчы ў СССР тымі, якія спадзяваліся знайсьці работу ў Расіі».

Вось як пісала фашысцкая прэса ўпершы раз аб гэтым выпадку.

На другі дзень 23 жніўня эндэцкі «Дзеньнік Віленскі» ў нумары 192 пад дыктоўку дэфэнзывы, праліваючы кракадзіловыя сьлёзы аб лёсе «няшчаснага сялянства», ужо піша:

«Што схіліла гэтых няшчасных сялян да ўцяканьня ў СССР? І тут-жа дае адказ. — У апошні час на абшары паасобных гмін Мацадзчынскага, Пастаўскага, Браслаўскага, Дзісьненскага і Вілейскага паветаў зьявіліся якіясьці падазроныя асобы, якія праводзілі інтэнсыўную агітацыю сярод сялян і сялянак за выезд у СССР на работы. Агітатары пазакладалі ў паветах кансьпірацыйныя вярбовачныя бюро, дзе прымалі мужчын і жанчын ва ўзросьце ад 20 да 30 год на выезд у СССР. Савецкія агенты абяцалі сялянам залатыя горы, апрача таго кожны вяжджаючы меў атрымаць па 100 руб. на дарогу.

Кансьпірацыйныя вярбовачныя бюро, сяляне, якія запісаліся, зараз-жа групамі ад 40 да 120 чалавек, нават з конымі, адсылалі на зборныя пункты, адкуль ужо досьвітнямі або ноччу пераправаўлялі на тэрыторыю СССР.

Паведамлёная аб гэтым улада прыступіла да ліквідацыі гэтых кансьпірацыйных вярбовачных бюро».

Такім чынам на другі-ж дзень фашысцкія пісакі апрача «бальшавіцкіх агітатараў» выкапалі ўжо нават і дэталь міфічныя «вярбовачныя бюро» і суму якую нібы «бальшавіцкія агенты» мелі даць кожнаму выяжджаючаму ў СССР на дарогу.

25 жніўня орган крэсавых аўброў, манархічнае «Слово» вядомага пана Мацкевіча ў нумары 193 пісала ўжо:

«Агенты бальшавіцкія, ходзячы па вёсках, гаварылі, што кожны селянін які выедзе ў СССР, атрымае адразу месца ў зямляробчай камуне (запамятаем гэта добра.—С. Ж.), а былыя вайсковыя будуць прыняты на вайсковыя курсы і будуць афіцэрамі».

Пасьля такога паведамленьня крыку ніжэй у гэтай-жа карэспандэнцыі газэта з задавальненьнем адзначае, што ўлада прыступіла да ліквідацыі «вярбовачных бюро», што ў пагранічнай паласе, а іменна ў Дзісьненскім павеце, нібы арыштаваны два «бальшавіцкія агенты», у Вілейскім і Маладэчанскім паветах— тры, а «вярбовачныя бюро» ліквідаваны. Трэба адзначыць, што пад відам ліквідацыі і пуканьня гэтых міфічных «вярбовачных бюро» акупанты пачалі ва ўсёй пагранічнай паласе масавыя аблавы, вобыскі і арышты рэвалюцыйных рабочых і сялян, пачалі крывавую расправу над імі. Так, манархічнае віленскае «Слово» ў нумары 196 падае, што ў адным толькі рабне Вілейкі і Паставы было арыштавана звыш 46 асоб.

Мы тут падаем дзень за днём падрабязна кожную новую рысу ў паведамленьнях фашысцкай прэсы, каб паказаць працоўным масам СССР усю правакацыйную гульню дэфэнзывы, з мэтай пусьціць пыл у вочы працоўным масам і ўтаіць сапраўдны стан рэчаў у гэтай справе.

Такім чынам уже 25 жніўня «вярбовачныя бюро» ў пагранічнай паласе, паводле паведамленьня «Слово», ужо былі ліквідаваны.

26 жніўня эндэцкі «Дзеньнік Віленскі» ўжо адкульсьці выкапаў, што сялянства з пагранічнай паласы сілай выганялася «бальшавіцкімі агентамі» ў Савецкі Саюз.

«Такі бальшавіцкі агент, выяжджаючы з вёскі Таргуны, разьвітаючыся з вёскай, абяцаў кожную селянскую хату. У часе гэтага разьвітаньня ён у кожнага пытаўся, ці пойдзе ў СССР. Тых, што адцягвалі з адказам, або не адважваліся, проста: «біў у морду», залёўлючы пры гэтым, што калі ня ўбачыць яго на другім баку граніцы, дык будзе яму дрэнна, калі іншыя ўцякачы ў хуткім часе вернуцца назад».

З гэтых нават паведамленьняў праглядвае поўная замешанасьць фашысцкай улады перад фактам масавага ўцяканьня сялян у Савецкі Саюз. У паведамленьнях у наступныя дні фашысцкія борзапісцы выдаюць сябе з галавой. Так, «Слово» і «Дзеньнік Віленскі» ад 26-га жніўня пішуць:

«Ня гледзячы на ліквідацыю вярбовачных бюро, з пагранічча даносяць аб новых спробах пераходу сялян у СССР».

Потым газэта падае факты пераходу граніцы новымі групамі сялян у раёнах Мільшэ, Даўгінава, вёскі Таргуны і інш., а таксама аб крывавай расправе над перабежчыкамі польскіх пагранічнікаў. Фашысцкая пагранварта, каб спыніць селянскую хвалю, расстрэльвала свае ахвяры кулямётным агнём, нават на тэрыторыі савецкай. Але і гэтыя драконаўскія меры не дапамагалі — сяляне ўцякаюць.

Масавае ўцяканьне сялян з Заходняй Беларусі ў Савецкі Саюз выклікала трывогу ў фашысцкіх колах. Каб зьменшыць вялізарнае ўражаньне ад гэтай падзеі, польскі фашызм, як заўсёды, аварачаецца да свайго ўлюбёнага мэтаду — правакацыі і антысавецкіх выпадаў супроць СССР. Забыўшыся аб тым, што толькі ўчора фашысцкая прэса пісала, што «бальшавіцкія агенты абяцалі селянам адразу-ж месца ў зямляробчых камунах», фашысцкія борзапісцы заклі аб уцяканьні гэтых людзей назад, зноў у ланы эксплёататараў, з прычыны нібы «прымусовай працы» ў гэтых-жа калектывах, аб галечы і тэрорыі. Памры Дзяніс, а лепш ня прыдумаеш.

29 жніўня эндэцкая шпата «Дзеньнік Віленскі» пад спэцыяльным загалоўкам у № 197 піша:

«З сялян учора ўцякло назад з СССР. Уцякачы расказвалі, што абяцаны ім рай і дабрабыт у СССР зьмяняецца хлусьнёй і фальшам. У першы-ж дзень свайго прабываньня на бальшавіцкай зямлі пераканаліся, што там панує галеча і тэрор. Мясцовых рабочых і сялян гоняць на калектыўныя работы пад зброяй, як нявольнікаў. Патрабуюць од іх цяжкай працы за нізкую зарплату, якое не хапае нават на пражыцьцё. На другі дзень нас мелі адправіць у калектывы на прымусовыя работы».

Далей, як заначае гэта эндэцкая шпата, гэтыя міфічныя ўцякачы нібы расказвалі, што «ўсе сяляне, якія ўцяклі з Польшчы, стараюцца вярнуцца назад у Польшчу, «толькі бальшавікі іх ня пускаюць» (!?). Зараз на працяту ўжо некалькіх дз

Год выданьня—XV
№ 241 (4146)
Субота 5 верасьня 1931
Цэнр нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гарэкому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 65.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,—сакратар—10-74, парэдактар—17-80, прамысл.—13-95, сап. закр.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, нашы рэкватар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторавы—6-61, вод. абанемент—2-47

„Працоўныя сяляне Зах. Беларусі!

Пад сьцягамі кампартыі гуртуйце свае сілы для канчатковай барацьбы супроць азьвярэлай беларускай паліцэйшчыны і жандармэрыі!"

Памяці нястомнага барацьбіта і рэвалюцыянэра А. В. Канчэўскага

Да ўсіх мопраўцаў БССР

Трагічна загінуў у часе лячэньня адзін з самых лепшых барацьбітоў за пралетарскую справу, верны сын працоўнай падняволенай Заходняй Беларусі член ЦК КПЗБ тав. А. У. КАНЧЭЎСКІ.

Сьмерць вырвала тав. Канчэўскага з радоў змагароў у момант асаблівага напружаньня клясавых баёў у Польшчы і Заходняй Беларусі. Сьмерць тав. Канчэўскага—цяжкая страта для ўсяго рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі і Польшчы, асабліва зараз, калі кампартыя Заходняй Беларусі вядзе рабочых і сялян да рашучых баёў за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры.

ЦК МОПР'у БССР выказвае свой глыбокі жаль і спачуваньне КПЗБ і яе Цэнтральнаму Камітэту з прычыны прадчаснай трагічнай сьмерці тав. А. У. Канчэўскага, члена ЦК КПЗБ.

ЦК МОПР'у БССР заклікае ўсе арганізацыі МОПР'у БССР яшчэ больш узмацніць мопраўскую работу па правядзеньні Кампаніі Зімовае Дапамогі палітзьняволеным, з гонарам выканаць узятыя на сябе сацыялістычны абавязак па рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы» сярод аднаасобнага сэктару на суму 3.800.000 руб. і актыўнага ўдзелу ў пасьпяховым правядзеньні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній. Гэта будзе лепшым адказам на зьверствы фашызму.

ЦК МОПР'у заклікае ўсю Менскую арганізацыю МОПР'у прыняць удзел у пахаваньні тав. Канчэўскага.

Замест вянкоў на магілу тав. Канчэўскага, сродкі пераслаць у фонд дапамогі палітзьняволеным Польшчы і Заходняй Беларусі. Уносіць гэтыя сродкі на спэцыяльны адчынены рахунак у Менскае аддзяленьне Дзяржбанку.

ЦК МОПР'у БССР.

ПАМЯЦІ ПРЫЯЦЕЛЯ І РЭВАЛЮЦЫЯНЭРА

Загінуў тав. Владек — так называлі і так ведалі Ўладзімера Канчэўскага ў КПЗБ усе рабочыя і сялянскія рэвалюцыянэры Заходняй Беларусі. Загінуў у момант, калі больш за ўсё быў-бы патрэбен для справы рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага. Рэвалюцыйная барацьба рабоча-сялянскіх мас ва ўсёй Польшчы, на чале якое стаіць геройчная КПП падыходзіць да свайго пераломнага канца.

Рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі, на чале з адзінай рэвалюцыйнай партыяй пралетарыяту — КПЗБ — у супольным саюзе з рабочымі і сялянамі ўсёй Польшчы прымаюць у гэтай барацьбе актыўны удзел, наносяць удар за ударам у фундамант фашысцкай дыктатуры.

Адбываюцца магутныя масавыя забастоўкі рабочых як у Польшчы, таксама і ў Заходняй Беларусі. Абараняючыся ад фабрыканцкіх атак, рабочыя нарываюць з сацыял-фашысцкімі дапаможнікамі капіталістаў і шырокім адзіным фронтам ідуць у контр-атаку на капіталістаў, на фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага.

Прыдушанае цяжарам падаткаў, шарваркаў і грабежніцкай фашысцкай зямельнай палітыкай працоўнае сялянства масава выступае і гоніць вон падатковых экзэкутараў і паліцыю, дае масавы ўзброены адпор карным экспедыцыям.

Беспрацоўныя, у якіх фашысцкі ўрад адабраў апошні кавалак хлеба, каб зробленыя такім чынам зьберажэньні выкарыстаць на ваенную падрыхтоўку супроць СССР, — масава выходзяць на вуліцы і патрабуюць хлеба і працы, гінуць пад градам куль ад рук фашысцкіх катаў.

Неспакойна і за мурамі вастрогаў. 10-цігысячны атрад пралетарскіх рэвалюцыянэраў-палітзьняволеных засталіся вернымі і нязломнымі барацьбітамі рэвалюцыі. Каб зламаць іх, каб зьнішчыць іх фізычна, урад уводзіць норы турэмны закон, робіць правам тое, што нават у царскіх сатрапаў лічылася бясправ'ем.

Рэвалюцыйная барацьба ідзе і за мурамі вастрогаў.

Рабочыя і сяляне, усе прытлачаныя польскім імпэрыялізмам узмацняюць свае рады, гуртуюцца пад сьцягамі КПП і КПЗБ, разгортваюць фронт, пераходзячы ў контр-наступленьне на фашысцкую дыктатуру. Набліжаецца момант, калі пад ударамі рэвалюцыі будзе звалена крывавая дыктатура Пілсудзкага.

Восем год свайго жыцьця аддаў тав. Владек для гэтай справы і загінуў, недачакаўшы вынікаў сваёй работы, на самым пароге рэвалюцыйных падзей. Праедзеныя сухотнымі мікробамі — пастаяннымі насельнікамі вастрожных камэр — лёгкія, аслабленае цяжкімі 10-цідзённымі галадоўкамі ў фашысцкіх турмах сэрца ня вытрымала.

Тав. Владек быў адным з нямногіх, які стаяў у калысны толькі што народжанай, яшчэ маладой і неўмацаванай КПЗБ.

У той час, калі вядомы правакатар М. Гурын (Маразоўскі) арганізаваў унутры КПЗБ «сэцэсію», г. зн. антыпартыйную контр-рэвалюцыйную апазыцыю, і зрабіў раскол, каб зламаць і разбурыць маладую КПЗБ (1924-1925 г. г.), тав. Владек быў ужо «пад замком» на Лукішках. Але і там сярод палітзьняволеных ён моцна стаіць на бальшавіцкай лініі партыі, змагаецца за яе, вядзе барацьбу з «сэцэсіяй».

З васьмі гадоў сваёй рэвалюцыйнай дзейнасьці тав. Владек пяць год прабыў у вастрозе, моцна трымаючы рэвалюцыйны сьцяг, змагаючыся супроць усялякіх праяўленьняў упадку, панікі, якія наглядаліся сярод слабейшай часткі палітзьняволеных.

У турмах тав. Владек заўсёды быў у кіраўніцтвах нелегальных арганізацый палітзьняволеных. Седзячы ў Лукішках, ён быў старастаю палітзьняволеных і, не шкадуючы свайго здароўя і жыцьця, ён бараніў сваіх таварышоў, якіх крыўдзілі вастрожныя каты. Аб гэтым добра ведаюць розныя наглядчыкі Барэйшы і начальнікі Барташэвічы на Лукішках і для гэтага будуць яны, калі даведаюцца аб сьмерці тав. Владека, знаёмага і ненавіснага ім старасты Канчэўскага, папіраць ад радасьці рукі.

Няхай радасьць іх ня будзе вялікай.

Тысячы палітычных зьняволеных усёй Польшчы, якія ведалі і шанавалі тав. Владэка і разам з ім змагаліся, цярпелі мукі галадовак, на момант схіліць свае галовы пры атрыманьні сумнай весткі аб сьмерці тав. Владэка, але яшчэ больш загартуюць сваё сэрца і волю на далейшую барацьбу.

Загінуў рэвалюцыянэр, дысцыплінаваны салдат партыі, але справа, за якую ён змагаўся і якую не давёў да канца, — забясьпечана. КПЗБ і яе ЦК. членам якога быў тав. Владек, заменяць яго другімі, такімі-ж стойкімі рэвалюцыянэрамі бальшавікамі — паліткатаржанамі, якія адкажуць яшчэ мацнейшымі ўдарамі супроць фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага.

П. К.

Узор сапраўднага Бальшавіка

Трагічны выпадак вырваў тав. Канчэўскага з рэвалюцыйных радоў. Ведаем яго па яго рэвалюцыйнай дзейнасьці, дзе ён служыў прыкладам сумленнасьці і адданасьці справе, як найлепшы сярод нас. Сьмерць яго глыбока нас расчуліла, бо яго праца і заслугі давалі нам упэўненасьць, што калі-б ён жыў далей, дык як і да гэтага часу ахвяраваў-бы свае сілы справе вызваленьня рабочай клясы з-пад капіталістычнага ярма, справе будаўніцтва сацыялізму ў Савецкім Саюзе. Савецкі Саюз страціў у ім аднаго з найлепшых сваіх абаронцаў. Яго вера ў перамогу будаўніцтва сацыялізму, у волю рабочай клясы Савецкага Саюзу закончыць сацыялістычнае будаўніцтва—была непахісная. Ён заўсёды востра змагаўся супроць тых, якія гэтае будаўніцтва хацелі тармазіць, не разумелі труднасьцяй будаўніцтва.

КПП, рабочая кляса Польшчы і міжнародны рэвалюцыйны рух страцілі ў асобе тав. Канчэўскага аднаго з найбольш адданых таварышоў. Фашысцкі тэрор у Польшчы ня мог ні на хвіліну стрымаць яго рэвалюцыйнай актыўнасьці. Польскі фашызм ведаў, што гэты таварыш зьяўляецца адным з самых чынных і самых страшных яго праціўнікаў і таму ня раз жорстка з ім распраўляўся. Тав. Канчэўскі заўсёды быў на выпыні свайго становішча. Бязупынна і з запалам змагаўся ён за вызваленьне прапоўных мас Заходняй Беларусі з-пад уціску польскага капіталізму, за перамогу пралетарскай рэвалюцыі. Таму ён заўсёды змагаўся супроць правага і «левага» ўхілаў ад генэральнай лініі партыі і быў у гэтых адносінах узорам сапраўднага бальшавіка.

Мы, заграніччныя таварышы ўшануем памяць тав. Канчэўскага нязломнай барацьбой у абароне Савецкага Саюзу супроць капіталізму, за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю.

Ад імя групы заграніччных таварышоў: ЭЗЕ—ад кампартыі Італіі, ПЕТЭРМАН—ад кампартыі Нямеччыны.

Адкрыты ліст калгасьнікаў нацыянальнага польскага калгасу „На варце", Капыльскага раёну

У адлегласьці ня больш, як паўтары клм. ад нашай былой в. Выньня (Бабаўнянскага сельсавету), а зараз буйнога калгасу «На варце» праходзіць дзяржаўная мяжа: БССР і фашысцкая белапанская Польшча.

Тут—у БССР, неадлучнай частцы вялікага Савецкага Саюзу — бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету — пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі рабочая кляса ў цесным саюзе з калгаснікамі — асноўнай апорай партыі і савецкай ўлады на вёсцы — уласнымі сіламі і сродкамі будуе сацыялізм.

З году ў год растуць усё новыя і новыя буйныя сацыялістычныя фабрыкі і заводы. У гэтым 3-цім рашаючым годзе пяцігодкі ўступае ў строй 518 НОВЫХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ І 1040 МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ.

Растуць усё новыя і новыя сацыялістычныя гаспадаркі — саўгасы і калгасы. Пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскай партыі мільёны бядняцка-батрацкіх гаспадарак ідуць па правільным шляху — шляху калектывізацыі.

Па БССР 45 проц. бядняцка - сераднякіх гаспадарак знаходзяцца ўжо ў калгасах. Наш прымежны раён — Капыльшчына — калектывізаваны ўжо на 60,2 ПРОЦ. УСІХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК РАЁНУ, на Капыльшчыне ёсьць ужо 160 КАЛГАСАЎ. Наш-жа прымежны Бабаўнянскі сельсавет калектывізаваны ўжо НА 33 ПРОЦ. У нашым сельсавеце ў асноўным закончана ўжо суцэльная калектывізацыя і практычна ажыцьцяўляецца на гэтай аснове ліквідацыя кулацтва як клясы.

Дзякуючы клопатам камуністычнай партыі і савецкай улады з кожным годам адкрываюцца ўсё новыя і новыя вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы, у якіх навучаюцца рабочыя, калгасьнікі, беднякі і сераднякі — аднаасобнікі — заўтрашнія калгасьнікі розных нацыянальнасьцяй.

У БССР КОЖНАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦЬ (БЕЛАРУСКАЯ, ПОЛЬСКАЯ, ЯЎРЭЙСКАЯ, ЛАТЫСКАЯ І ІНШ.) МАЕ ПОЎНУЮ МАГЧЫМАСЬЦЬ РАЗЬВІВАЦЬ СВАЮ КУЛЬТУРУ, НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПА ФОРМЕ І САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПА ЗЬМЕСЬЦЕ.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі раз і назаўсёды вырашана нацыянальнае пытаньне, ажыцьцяўляецца нацыянальная палітыка ў БССР, як і наогул ва ўсім Савецкім Саюзе. Дзякуючы клопатам партыі і савецкага ўраду зьнішчана беспрацоўе, з КОЖНЫМ ГОДАМ ПАЛЯПШАЕЦЦА ДАБРАБЫТ ШЫРОКІХ РАБОЧЫХ, КАЛГАСНЫХ І БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ МАС.

Там, па той бок дзяржаўнай мяжы — у фашысцкай белапанскай Польшчы, у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне азьвярэлая паліцэйшчына і жандармэрыя пілсудчыкаў шляхам увядзеньня розных законаў, шампаламі, турмамі, забойствамі і сілаю зброі імкнецца стрымаць нарастаючую пралетарскую рэвалюцыю.

ТАМ, У ПОЛЬШЧЫ 10.000 ЛЕПШЫХ НАШЫХ БРАТОЎ-РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ КІНУТА У БЕЛАПАНСКІЯ ТУРМЫ, ЗНАХОДЗЯЦЦА ПАД ПАГРОЗАЙ ФІЗЫЧНАГА ЗНІШЧЭНЬНЯ. МІЛЬЁНЫЯ МАСЫ БССР ПРАТЭСТУЮЦЬ СУПРОЦЬ РАЗГУЛУ ФАШЫСЦКАЙ БЕЛАПАНСКАЙ СВОЛАЧЫ, АПРЫЧНІКАЎ.

МЫ, КАЛГАСЬНІКІ ПРЫМЕЖНАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОЛЬСКАГА КАЛГАСУ «НА ВАРЦЕ», УЗЬНІМАЕМ СВОЙ РАШУЧЫ ГОЛАС ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ ГВАЛТАЎ І ЗЬДЗЕКАЎ РАЗЬЮШАНЫХ БЕЛАПАНСКІХ НАЙМІТАЎ І РАЗАМ З УСІМІ ПРАЦОЎНЫМІ БССР ПАТРАБУЕМ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ ЎСІХ НАШЫХ БРАТОЎ, СЁСТРАЎ, І БАЦЬКОЎ ПА КЛЯСЕ — ЛЕПШЫХ БАРАЦЬБІТОЎ - РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ ЗА СПРАВУ СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

Таварышы працоўныя сяляне Заходняй Беларусі, змагары за пралетарскую рэвалюцыю! Мы, калгасьнікі калгасу «На варце», сабраўшыся 29-га жніўня 1931 г. у новапабудаванай школе 7-годкі, абгаварылі нашы бягучыя задачы ў працы калгасу, а таксама жыцьцё працоўных сялян у Заходняй Беларусі.

Мы хочам расказаць вам, як мы жылі раней, як жывем зараз і як маркуем жыць.

Большасьць з нас яшчэ летась працавалі на аднаасобных гаспадарках, гібелі на вузкіх загонах зямлі. Вечнымі нашымі ворагамі зьяўлялася вузкапалосіца, дальназямельле, межы. Мы парашылі, што жыць так далей, як жылі нашы дзяды і бацькі, нельга. ТАМУ МЫ ПАРАШЫЛІ КІНУЦЬ НАЗАЎСЁДЫ ВУЗКІЯ СВАЕ ЗАГОНЫ ЗЯМЛІ, АДНААСОБНУЮ ГАСПАДАРКУ І ПАЙСЬЦІ ПА ПРАВЕРАНЫМ ЛЕНІНСКІМ ШЛЯХУ — ШЛЯХУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. У нашай вёсцы Выньня, якая налічвае 130 гаспадарак, КАЛЕКТЫВІЗАВАНА ЎЖО 105 БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы па-новаму пачалі весьці сваю калектыўную гаспадарку плошчай каля 900 га зямлі. НА НАШЫХ ПАЛЁХ НЯМА ЎЖО МЕЖАЎ, СТАЛЁВЫЯ КОНІ — ТРАКТАРЫ ЗНІШЧЫЛІ МЕЖЫ РАЗ І НАЗАЎСЁДЫ.

Мы палаем энтузіязмам сацыялістычнага будаўніцтва, бо ведаем, што БУДУЕМ ДЛЯ СЯБЕ.

Дзякуючы правядзеньню зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх, мы сёлета па-ўдарнаму правялі другую бальшавіцкую сяўбу, закончылі з посьпехам уборку азімых і яравых пасеваў і рыхтуемся зараз да асеньняй сяўбы, каб засеяць ня менш 300 гэктараў (з якіх 250 жыта і 50 пшаніцы) азімых.

МЫ ПАЗНАЛІ НЕВЯДОМАЕ... АД ДЗЯДОЎ ДА БАЦЬКОЎ ЦЯГНУЛІСЯ ЗАКАРУЗЛЫЯ СТАРЫЯ ЗВЫЧАІ — ГЭТА САМАЯ СТРАШНАЯ Ў СЬВЕЦЕ СІЛА, ЯКАЯ СКОЎВАЛА НАС У ПАКОРНАСЬЦІ ПЕРАД СТЫХІЯЙ. ЗАРАЗ МЫ ВЯДЗЕМ НОВУЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ КАЛЕКТЫЎНУЮ ГАСПАДАРКУ ПАВОДЛЕ СТРОГА ВЫЗНАЧАНАГА ПЛЯНУ. МЫ ПАЗНАЛІ ВЯЛІКУЮ РОЛЮ ПЛЯНАВАГА ВЯДЗЕНЬНЯ ГАСПАДАРКІ.

Нам паводле пляну трэба пабудаваць у гэтым годзе сьвінарнік НА 100 СЬВІНАМАТАК, ЗАСІЛАСАВАЦЬ 100 ТОН ЗЯЛЁНЫХ КАРМОЎ, ЗАСЕЯЦЬ 300 ГЭКТАРАЎ АЗІМЫХ.

Будаўніцтва сьвінарніка хутка будзе закончана.

Пад жыта падрыхтавана ўжо больш 200 гэктараў зямлі. Засіласавана ўжо 20 тон сіласу і выкапана 1 сіласная трашэя ёмістасьцю ня менш 50 тон сіласнай масы.

Сёньня, 29-га жніўня, на нашым сходзе наша калгасьніца ЮХА МАНЯ сказала: «ПЯЦЬ РАЗ ТРЭБА ПАДЗЯКАВАЦЬ САВЕЦКАЙ УЛАДЗЕ ЗА ТОЕ, ШТО ЯНА ПАБУДАВАЛА Ў НАШАЙ ВЁСЦЫ ГЭТКУЮ ПРЫГОЖУЮ, ПРАСТОРНУЮ ШКОЛУ». Гэта словы калгасьнікаў, беднякоў, сераднякоў — аднаасобнікаў.

Пралетарская дзяржава на пабудову нашай школы 7-мігодкі выдаткавала КАЛЯ 30.000 РУБЛЁЎ. У гэтай школе НАШЫ ДЗЕЦІ БУДУЦЬ НАВУЧАЦЦА НА СВАЁЙ РОДНАЙ ПОЛЬСКАЙ МОВЕ.

Пішучы пра гэтыя дасягненьні, мы можам не сказаць і пра тыл Дзіцячыя ясьлі, на пабудову якіх пралетарская дзяржава адпусьціла 13.000 РУБЛЁЎ.

Дзіцячыя ясьлі будуць выхоўваць нашых дзяцей па-новаму ў камуністычным духу і вызваляць нашых жанчын ад дробнага клопату.

МЫ, КАЛГАСЬНІКІ КАЛГАСУ «НА ВАРЦЕ», НА ГВАЛТЫ І ЗЬДЗЕКІ РАЗЬЮШАНЫХ, АШАЛЕЛЫХ ФАШЫСТАЎ НАД ПРАЦОЎНЫМІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АДКАЗВАЕМ:

1. УСЕ, ЯК АДЗІН, УСТУПАЕМ У РАДЫ МОПР'у.
2. БУДЗЕМ ПА - БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ, КАБ ВЫКАНАЦЬ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ АСЕНЬНІ ПЛЯН—ЗАСЕЯЦЬ НЯ МЕНШ 300 ГЭКТАРАЎ АЗІМЫХ.
3. ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ І ПЕРАВЫКАНАЦЬ ПЛЯНЫ СІЛАСАВАНЬНЯ — ЗАСІЛАСАВАЦЬ НЯ МЕНШ 100 ТОН ЗЯЛЁНАЙ МАСЫ.
4. ЗАКОНЧЫЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ БУДАЎНІЦТВА СЬВІНАРНІКАЎ НА 100 СЬВІНАМАТАК І ЎКАМПЛЕКТАВАЦЬ ЯГО ТЫМІ ПЛЕМЯННЫМІ СЬВІНАМАТКАМІ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў АДНААСОБНЫМ НАШЫМ КАРЫСТАНЬНІ.
5. МЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА 900 РУБЛЁЎ НА ПАЗЫКУ «ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ», МЫ ЛІЧЫМ, ШТО ГЭТА ЛІЧБА МАЛАЯ. На пабудову 518 сацыялістычных фабрык і заводаў і 1.040 машына-трактарных станцый пралетарскай дзяржаве патрэбны грошы. ТАМУ МЫ ЛІЧЫМ НЕАБХОДНЫМ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПАДПІСКУ НА ПАЗЫКУ НЯ МЕШ, ЯК НА 3-ТЫДНЕВЫ ЗАРАБОТАК КОЖНАГА З НАС І ВЫКЛІКАЕМ ПАСЬЛЕДАВАЦЬ НАШАМУ ПРЫКЛАДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-ПАЛЯКАЎ «ОРКІ», БАБАЎНЯНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ.

Браты па клясе, барацьбіты за пралетарскую рэвалюцыю, працоўныя сяляне Заходняй Беларусі!

Напружвайце, гартуйце свае сілы для канчатковай барацьбы з азьвярэлай белапанскай паліцэйшчынай і жандармэрыяй, якія імкнуцца задушыць рэвалюцыйна-вызваленчы рух, пад кіраўніцтвам КПЗБ змагаецца за свае сакрэтныя і нацыянальнае вызваленьне.

Няхай ведаюць памешчыкі, фашысты-пілсудчыкі, кулакі і іх агенты, што мы, калгасьнікі прымежнага нацыянальнага польскага калгасу «На варце», будзем і надалей пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі змагацца за суцэльную калектывізацыю і на яе аснове за ліквідацыю кулацтва як клясы.

А калі фашысцкая белапанская Польшча паспрабуе напасьці на Савецкі Саюз, мы, КАЛГАСЬНІКІ КАЛГАСУ «НА ВАРЦЕ», ДА АБАРОНЫ САВЕЦКІХ МЕЖАЎ ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ І ГРУДЗЬМІ СТАНЕМ УСЕ, ЯК АДЗІН, НА АБАРОНУ ЗАВАЯВАНЬНЯЎ ЧЫРВОНАГА КАСТРЫЧНІКА.

Няхай жыве камуністычная партыя — кіраўнік пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

Прэч фашысцкія гвалтаўшчыкі, зьдзекі над лепшымі рэвалюцыянэрамі Польшчы! Сьмерць катам!

Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя Польшчы і ва ўсім сьвеце!

(Пад лістом 105 подпісаў калгасьнікаў нацыянальна-польскага калгасу «На варце»).

„Разьвіцьцё крызісу абганяе тэмп работы Лігі Нацый"

Тав. Літвінаў абараняе савецкі праект дагавору аб эканамічным ненападзеньні

ЖЭНЭВА, 1. Абмеркаваньне савецкага праекту аб эканамічным ненападзе, на пасяджэньні эўрапэйскай падкамісіі, адбывалася пры зачыненых дзьвярох.

Пасяджэньне адчынілася кароткай прамовай тав. Літвінава, які заявіў: «Савецкая прапанова настолькі ясна, яе структура і мэты настолькі простыя і відавочныя, што не маюць патрэбы ў падрабязных растлумачэньнях. Улічваючы, аднак, выказаныя на мінулай сэсіі сумненьні, асноваными, па маім перакананьні, на незразуменьні сутнасьці савецкай прапановы, я лічу неабходным зрабіць паясьняльную заўвагу». Тав. Літвінаў далей растлумачвае, што пакт аб адмаўленьні ад эканамічнай агрэсіі пабудаваны на прынцыпе недыскрымінацыі (недапушчальнасьць устанаўленьня ў адносінах якой-небудзь краіне спэцыяльных пагоршаных умоў для другой краіны, якія прадстаўляюць выключэньне з агульнага, устаноўленага для ўсіх, рэжыму).

Прынцып недыскрымінацыі ня толькі не супярэчыць найбольшаму спрыяньню, але зьяўляецца натуральным дапаўненьнем яго. Адмова ад эканамічнай агрэсіі ні ў якай меры не абмяжоўвае правы дзяржавы заключаць тандлёвыя дагаворы, аснованыя на ўзаемных уступках.

У заключэньне тав. Літвінаў зазначае, што ён ўнёс праект пакта аб эканамічным ненападзе яшчэ на майскай сэсіі і тады прадстаўнікі пасобных дзяржаў, ня робячы заўваг па сутнасьці, паказвалі на тое, што ня могуць прыняць яго зараз-жа, бо ня ведаюць пункту погляду сваіх урадаў. За мінулыя чатыры месяцы, прысутныя прадстаўнікі эўрапэйскіх дзяржаў, зразумела, мелі магчымасьць, азнаёміцца з пунктам погляду сваіх урадаў. У сувязі з гэтым тав. Літвінаў выказвае надзею, што на гэтай сэсіі зможацца магчымым прыняць канчатковую пастанову па сутнасьці праекту.

Потым выступае італьянскі міністар замежных спраў Гранды, які заяўляе, што італьянскі ўрад з вялічайшай сымпатыяй адносіцца да прыняцьця, агалошаных у савецкім праекце, бо адмова ад эканамічнай агрэсіі зьяўляецца істотнейшай умовай аднаўленьня даверʼя—гэтай неабходнай прадпасылкі міра. Таму італьянскі ўрад з задавальненьнем дапускае да ідэі, сфармуляванай тав. Літвінавым.

Потым бярэ слова французкі дэлегат Франсуа Понсэ, які заяўляе, што ён на зусім згодны не з самой ідэяй пакту, а з мэтадам яго абгаварэньня. Пытаньне патрабуе глыбокага вывучэньня і не дарэмна Літвінаў скарджыцца на тое, што за чатыры месяцы нічога ня зроблена. Французкі ўрад быў занят іншымі справамі. Франсуа Понсэ прапануе перадаць пытаньне для вывучэньня ў эканамічны камітэт Лігі Нацый з прыцягненьнем прадстаўніка СССР.

Наступны выступае нямецкі міністар замежных спраў Курцыус, які паведамляе, што ён яшчэ ў маі паказваў на тое, што нямецкая дэлегацыя адносіцца да савецкага праекту з вялікай сымпатыяй. Курцыус лічыць, што савецкая дэлегацыя мае права пасьля чатырох месяцаў чакаць дыскусіі, якая-б зрабіла пакт гатовым для падпісаньня.

Адказваючы на выступленьне тав. Літвінаў паказвае на тое, што на мінулай сэсіі ня было ні супярэчаньняў, ні заўваг па сутнасьці савецкага праекту і ня было створана для разгляду гэтага праекту ніякіх падкамісій, відавочна, у сілу яснасьці савецкай прапановы. Між тым, цяпер прапануюць перадаць пытаньне для дадатковага вывучэньня. Работа Лігі Нацый разгортваецца найзвычай марудна. Між тым разгортваньне крызісу, які не абавязан пераходзіць з камісій у падкамісіі, на многа абганяе тэмпы іх работ. «Гаворачы гэта, —заяўляе тав. Літвінаў, — я зусім не клапочуся аб пасьпяховасьці работы Лігі Нацый. Мяне цікавіць толькі справа міра. Я ня згодзен з Франсуа Понсэ, што ўрады павінны займацца любымі справамі, а пытаньнямі міра «толькі ў гадзіны дасуга».

У заключэньне прымаецца прапанова аб перадачы пытаньня ў рэдакцыйную камісію з тым, што канчатковыя пастановы аб далейшай працадуры будуць ухвалены пленумам эўрапэйскай камісіі.

Электрыфікацыя Савецкай Беларусі

МАСКВА. (ТАСС). Пры Энэргацэнтры адбылася нарада па электрыфікацыі БССР; на гэтай нарадзе быў заслухан дакład прадстаўніка арганізацыі тав. ЧУДКОЎСКАГА.

Адзначыўшы вялізарны рост народнае гаспадаркі БССР т. ЧУДКОЎСКІ падкрэсьліў, што ў аснову далейшага разьвіцьця Савецкай Беларусі пакладзены плян электрыфікацыі. Разгортваньне сеткі электрастанцый у 1933-37 гадох будзе зуецца на вялізарных запасах торфу. Калі ня лічыць маладасьледаванай часткі БССР, дык пакілады тарфянога апалу, паводле папярэдніх даных, вызначаюцца прыкладна Ў ПАЎТАРЫ МІЛЬЯРДЫ ТОН паветранага сухога торфу. Аркамітэт пры Дзяржпляне БССР вызначае павялічыць да 1937 году агульную магутнасьць цяперашніх электрастанцый прыблізна Ў 100 РАЗ.

Нарада выказалася за давядзеньне магутнасьці запраектаваных станцый. У другой пяцігодцы ў ДА 300.000 КІЛЁВАТ. Для больш дзейнай распрацоўкі пляну электрыфікацыі Савецкай Беларусі створана спэцыяльная камісія.

Ад камісіі па арганізацыі пахаваньня тав. Канчэўскага А. Ул.

КАМІСІЯ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПАХАВАНЬНЯ ТАВ. КАНЧЭЎСКАГА ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО З ПРЫЧЫНЫ НЯМРЫБЫЦЬЦЯ ЦЕЛА ПАХАВАНЬНЯ НЕ ПЕРАНОСІЦЦА З 5 НА 6 ВЕРАСЬНЯ, НА 17 ГАДЗ. ВЫНАЕ ЦЕЛА З ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ НА БРАЦКІЯ МОГІЛКІ Ў 17 ГАДЗ. ДОСТУП ДА ЦЕЛА ДЛЯ ЎСІХ АДКРЫТЫ АД 12 ДА 16½ ГАДЗ. У ДОМЕ КАМАСЬВЕТЫ.

КАМІСІЯ.

Паведамленьні

— Аддзел кадраў Менгаркому КП(б)Б паведамляе, што 5 верасьня, у 7 гадз. веч., у памяшк. Менгаркому КП(б)Б (пашыня № 11) склікаецца нарада ўсіх старшыняў ЗРК, ТПО, галінавых аб'яднаньняў БКС, аддзелу кадраў БКС, МЦРК, грамадзкага харчаваньня, гарінспэктуры працы, кіраўніцтва кадрамі г. Менску, Наркамправы па пытаньні падрыхтоўкі кадраў клапэрацыйнай сыстэмы.

— Дом пісьменьніка, 5-га верасьня, у 7 гадз. вечара — агульны сход пісьменьнікаў. Парадак дня: 1. Аб пабудове Дому Пісьменьнікаў. 2. Бягучыя справы. Явка абавязкова.

Кіно-Тэатр „ЧЫРВ. ЗОРКА" З СУБОТЫ, 5 ВЕРАСЬНЯ
ПРЭМ'ЕРА! Зялікі мастацкі фільм вытворчасьці Саюзкіно
ЦІХІ ДОН
Ў 7 частках паводле выдатн. твору М. Шолахава.
РЭЖЫСЭРЫ: О. ПРЭАБРАЖЭНСКАЯ І І. ПРАВАЎ
У галоўных ролях:
Казак Панцелей Мелехаў—засл. арт. Падгорін
Яго. малодшы сын Рыгор—Абрыкосаў
Яго. старшы сын Пётра—Громаў
Жонка Пятра—Дар'я—Максімава
Аксіньня Астахава—Э. Цэсарская
Муж Аксіньні—Сьцяпан—Г. Каўроў
Натальля Каршунова—Р. Пужная
Геранджа—І. Быкаў
Ашмарін Лістніцкі—С. Чуракоўскі
Зьвыш праграм. „Буревесьнік" Фільм у і частцы
Пачатак сэансу у 7; 8-45; 10-30. Касса—з 5 г.
Асобы, якія спазьніліся, не дапускаюцца

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ з 5 верасьня адкрыта з 12 гадз. дня
На экране ПОЛА НЭГРЫ
Ў замежнай карціне
КАЛЮЧЫ ДРОТ
Пачатак 1-га дзённага сэансу ў 2 гадз., 2-га—ў 3 г. 30 м.
Пачатак вячэрніх сэансаў у 7, 8-40, 10-30.
Каса адкрыта штодзённа з 12 гадз. дня.
ЦЭНЫ на дзённыя сэансы ЗЬНІЖАНЫ.

„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы выдатны мастацкі бытавы фільм 2 МАТКІ 2 драма ў 6 частках.
„Пралетары" Адкрыта з 12 г. дня — Мастацкі фільм з жыцьця вучонага і паэты ЛАМАНОСАВА СЫН РЫБАКА.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Новы фільм ХЛОПЧЫК З ТАБАРУ Пачатак у 1 гадз. і 2 гадз. 30 м.
„СПАРТАК" Пач. 6-30, 8, 9-30 і 11 Каса—з 5 гадз. — З 1 верасьня заменены баявік КАМІЛА Драма ў 6 частках.

Сэктар кадраў Белптушпрадукту
паведамляе, што АДКРЫТ ПРЫЁМ у:
1. ФЗВ пры Полацкім яйка-птушкім камбінаце.
2. ФЗВ пры Жлобінскай яйка-птушкі й фабрыцы.
Прыём праводзіцца на базе 7-годкі ва ўзросьце ад 16 да 19 год. Правілы прыёму і падачы дакумантаў, як і ў іншыя ФЗВ і навучальныя ўстановы.
ФЗВ рыхтуе ўнівэрсальных рабочых, спэцыялістаў па яйка-птушнай прамысловасьці, тэарэтычна падрыхтаваных для паступленьня ў ВНУ.
Тэрмін навучаньня 2 гады.
Прынятыя ў ФЗВ забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй у разьмеры 35—40 руб. і спэцвопраткай і залічваюцца штатнымі рабочымі прадпрыемства.
Тэрмін падачы дакумантаў: у ПО